Аспрэчванне прыналежнасці да вышэйшага стану ў Рэчы Паспалітам было досыць распаўсюджанай з'явай і з'яўлялася сродкам захавання станавай карпарацыйнасці, паколькі "самазванства" было моднай справай не толькі па адносінах да царскага вянца. Чалавек, супраць якога высоўвалася абвінавачванне ў бяспраўным карыстанні з шляхецкіх прывілеяў і вольнасцяў, павінен быў прайсці праз шэраг выпрабаванняў і суровую экспертызу з боку павятовых уладаў. Механізм ажыццяўлення пацверджання шляхецтва, вядомы ў прынцыпе, вельмі слаба ілюструецца канкрэтнымі прыкладамі, бо спецыяльных публікацый такіх дакументаў няма. Таму не выпадкова нашу ўвагу прыцягнуў дакумент з загалоўкам "Cautia szlachetnemu Janowi Dziahilewiczowi pisarzowi mieskiemu Polockiemu wzglkdem mieszkania w Polocku", які быў адшуканы пад час працы з мікрафільмам кнігі запісаў метрыкі ВКЛ № 114 у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі.[8] Аналагічных па зместу дакументаў у кнігах запісаў метрыкі за першую палову XVIIст. намі больш не выяўлена.

Пасля традыцыйнага ўступу ў дакуменце паведамляецца, што каралю суплікаваў (скардзіўся) Ян Рыгоравіч Дзягілевіч, які на той час быў месцкім полацкім пісарам, пасля чаго аглядна падаюцца факты біяграфіі, якія пацвярджаюць шляхецтва яго продкаў і адпаведна яго асабістае. Такім чынам згодна з "Каўцыяй"(ад лац. cautio - гарантыя) бацька Яна Рыгоравіча Дзя-

гілевіча - Рыгор Сцяпанавіч Дзягілевіч, "прыціснуты фартунай", вымушаны быў ад'ехаць ад маёмасцяў сваіх земскіх дзедзічных і апынуўся ў Полацку, дзе на той час жыло шмат асоб рыцарскага шляхецкага стану. Тым не менш, Рыгор Сцяпанавіч Дзягілевіч не займаўся ніякімі забароненымі правам для шляхты заняткамі, а, уваходзячы ў месцкі магістрат Полацка, найперш клапаціўся аб абароне горада ад маскоўскага непрыяцеля і аб іншых публічных справах. Па яго смерці сын - Захар Рыгоравіч Дзягілевіч, брат Яна Рыгоравіча Дзягілевіча, ідучы "шляхам продкаў сваіх марсавым", прысвяціў сябе вайсковай справе: займаў урад паручніка пяхотнай роты Войцеха Рачкоўскага і быў забіты ў Інфлянтах пад Вэндэнам (Кесі). Вызначыць нават прыблізны час, калі мог загінуць З.Р.Дзягілевіч вельмі цяжка ўжо таму, што вайна ў Інфлянтах працягвалася са значнымі перапынкамі з 1600 па 1629гг., а сам Вэндэн некалькі разоў пераходзіў з рук у рукі. Далей паведамляецца, што і сам Ян Рыгоравіч Дзягілевіч, паколькі быў здольны з маладосці да вайсковай службы ("засмакаваўшы сабе рыцарскую службу"), то прымаў удзел у даўнейшых маскоўскіх экспедыцыях з немалымі для сябе стратамі. Відавочна, Я.Р.Дзягілевіч удзельнічаў у пачатковай фазе вайны Рэчы Паспалітай з Масквой 1609 -1618гг. Пазней ён напрацягу 27 гадоў служыў пры некалькіх земскіх пісарах у канцылярыі полацкага земскага суда "з выгодай усіх братоў абывацеляў Полацкага ваяводства". Між тым, з матэрыялаў кніг запісаў метрыкі вядома, што да склікання Міхалам Друцкім-Сакалінскім, полацкім ваяводай, элекцыйнага сойміка 3.XI.1617г. і абрання электам, а потым намінантам 20.XI.1617г. Міхала Тышкевіча, пасаду полацкага земскага пісара займаў Даніэль Шчыт Забельскі.[9] З 20.XI.1617г. і да аванса на падсудкоўства полацкае 15.III.1635г. полацкім земскім пісарам быў Міхал Тышкевіч, якога на гэтым урадзе замяніў Ян Падбіпента, былы полацкі чэсьнік.[10] Такім чынам, Я.Р.Дзягілевіч пачаў працу ў канцылярыі яшчэ пры Д.Шчыце Забельскім, служыў пры М.Тышкевічы і, магчыма, пры Я.Падбіпенце. Пасля гэтага полацкі магістрат „па прычыне пільнай увагі да паспалітых дабротаў і зычлівай стараннасці" запрасіў Я.Р.Дзягілевіча на ўрад месцкага полацкага пісара. Выконваючы свае абавязкі, як пазначаецца ў дакуменце, ён не займаўся шынкаваннем, рамёствамі і іншымі звыклымі для горада заняткамі, але жыў з прыбыткаў ад выканання пісарскай функцыі і ад трымання земскіх добраў. Апошнія абставіны мелі вырашальную значнасцьдля пацверджання шляхетнасці месцкага пісара. Нагадаем, што патрабаваў дваццаць пяты артыкул „О шляхте, которая бы у месте оселость принела" з трэцяга раздзелу Статута ВКЛ 1588г.: "Теж уставуем, иж гды

бы шляхтич, занехавши именья и обыстья своего шляхетского, або про худобу свою ишучы собе поживенья, ушол бы до места и мешкал там, торг местский ведучи або и шинок в дому маючи, и локтем меречы або ремесло робечи на верстате, таковый вжо з волностей шляхетских веселитисе не маеть. Ведь же естли бы потом тот шляхтич сам або сынове шинком и ремеством местским обходитисе не хотели и локтем не мерили, *к в***ы**шодшы засъ з места, наслядовали поступков рицерских продков своих, таковые маютъ быть за правую шляхту розумени"[11]. Відавочна, што менавіта гэты артыкул Статута 1588г. быў падставай для аспрэчвання шляхетнасці Я.Р.Дзягілевіча, які не мог не ведаць яго ўжо толькі па роду сваёй службы. Гэты ж артыкул даваў Я.Р.Дзягілевічу і контраргументы. Таму ў дакуменце настойваецца на тым, што ні сам месцкі пісар, ні яго бацькгі і брат не займаліся непажаданымі для шляхты заняткамі. Наступны сюжэт біяграфіі Я.Р.Дзягілевіча, закрануты ў дакуменце, быў шчыльна звязаны з падзеямі так званай Смаленскай вайны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай у 1632-1634гт. і павінен быў засведчыць аказаныя дзяржаве паслугі у першую чаргу ў якасці прадстаўніка шляхецкага стану. Калі маскоўскае войска ў 1633г., напаўшы на Полацк, знішчыла ўвесь горад, акрамя дзьвух замкаў, Я.Р.Дзягілевіч, не гледзячы на тое, што "у субстанцыі сваёй панёс шкоду", аднак, месца баявых дзеянняў не пакінуў, але стала знаходзіўся пра асобе польнага гетмана ВКЛ, якім на той час быў староста быстрыцкі і жыжморскі Крыштап Радзівіл.[12] Падчас знаходжання ў Полацку Я.Р.Дзягілевіч паспеў пабудаваць сабе дом у верхнім замку, які абараняў разам з іншымі, а таксама бываў па розных патрэбах на каравулах з павятовымі ротмістрамі. Акрамя гэтага, ён удзельнічаў побач з іншымі абывацелямі полацкага павета ў вайсковай аперацыі ў Мішневічах (паселішча на ўсход ад Полацка на месцы ўпадзення р.Усысы ў р.Обаль), калі ў выніку штурма было ўзята ў палон і прыведзена ў полацкі замак 300 "баярскіх сыноў". Дадзены факт у беларускай гістарычнай літаратуры не сустракаецца. Падрабязнае апісанне ўдзелу ў абароне Айчыны было важкім аргументам на карысць доказу прыналежнасці да вышэйшага стану, тым больш, што, як заўважыў Г.Віснэр, большасць актаў набілітацыі была дадзена менавіта за вайсковыя заслугі.[13] Усе доказы сваёй шляхетнасці: пацверджанні ад полацкага ваяводы, польнага гетмана, соймікавая атэстацыя ўсёй шляхты ваяводства, пацверджанне аб службе забітага ў Інфлянтах брата, а таксама розныя дакументы, якія даказвалі яго шляхецкія правы на земскія добра, пабаровыя квіты і іншыя аўтэнтычныя паперы, Я.Р.Дзягілевіч прадставіў у канцылярыю ВКЛ і "праз некаторых

Паноў Рад і ўраднікаў нашых дворных, якія на той час пры нас былі" звярнуўся са сваёй справай да Уладзіслава IV, які ўлічыўшы ўсе абставіны, умацаваў пісара месцкага і яго нашчадкаў у шляхецтве на вечнасць. Дакумент быў падпісаны каралём 13.11.1644г. у Вільні.

Відавочна, што Я.Р.Дзягілевіч здолеў паспяхова прайсці праз усе этапы выпрабавання яго шляхетнай годнасці. Як вынікае з "Каўцыі", дакументальныя доказы пры аспрэчванні шляхецтва, як і набілітацыі, прадастаўляліся павятоваму сойміку, а потым засведчваліся ў канцылярыі ВКЛ. Канчаткова вырашаў пацвердзіць ці не прыналежнасць да шляхты не сойм, як у выпадку з асобамі "простага стану", а кароль, для якога гэта было значным сродкам уплыву на тагачаснае грамадства.

Дадзеныя "Каўцыі" можна пацвердзіць і дапоўніць некаторымі іншымі матэрыяламі. Сярод дакументаў кнігі запісаў метрыкі ВКЛ № 113 знаходзіцца яшчэ адзін прывілей, адрасаваны непасрэдна Я.Р.Дзягілевічу: гэта канфірмацыя, ці пацверджанне, яму на дом у верхнім полацкім замку. Фактычна, у прывілеі ўдакладняюцца некаторыя нюансы, вядомыя з "Каўцыі": пасля таго як маскоўскія войскі спалілі полацкі пасад, Я.Р.Дзягілевіч атрымаў на падставе ліста Януша Кішкі, полацкага ваяводы, пусты пляц у верхнім полацкім замку і пабудаваў за ўласны кошт дом, пасля чаго ён звярнуўся да караля за пацверджаннем. Пры гэтым Я.Р.Дзягілевіч прадаставіў у якасці доказу аўтэнтычны ліст ваяводы, дадзены ў Полацку 5.XII.1633г. Каралеўскім рашэннем ад 13.XII.1639г. сам Я.Р.Дзягілевіч, яго жонка і нашчадкі атрымалі дазвол не толькі на вольнае валоданне згаданай маёмасцю, але ў дадатак дом вызваляўся ад стацыяў "людзей якой кольвек кандыцыі і стану", між іншымі ад слуг двара полацкага ваяводы. [14] Адзначым, што галоўнай мэтай звароту Я.Р.Дзягілевіча было атрыманне вызвалення ад стацыяў, якія надзвычай абцяжарвалі жыхароў горада. Аналагічныя прывілеі атрымлівалі і іншыя палачане. Так, у 1647г. да Уладзіслава IV звярнуўся Іван Фёдаравіч Скабіч, полацкі бурмістр. Цікава, што ён спасылаўся на прывілей Жыгімонта III ад 14.XII.1597г., узяты "экстрактам" з кніг вялікай канцылярыі ВКЛ, які быў выдадзены бурмістрам, райцам, лаўнікам і, што для нас мае асаблівую значнасць - пісарам полацім па прыкладу сталічнай Вільні, і вызваляў іх ад абавязка прадастаўляць жытло для прыязджаючых у горад шляхціцаў на час разнастайных з'ездаў. 30.V.1647г. полацкі бурмістр "на дажывотным праве" атрымаў "лібертацыю", паводле якой яго дом у Полацку, размешчаны брамай паміж дамамі Васіля Касабуцкага і Сямёна Цяцеры на Вялікай вуліцы, а тыльным бокам на Малой Вазнясенскай вуліцы, быў вазвалены ад "стацый"

падчас "рокаў земскіх, рочкаў гродскіх, соймікаў і іншых усялякіх з'ездаў"[15].

Яшчэ раз згадваецца Я.Р.Дзягілевіч у метрыцы пры досыць цікавых абставінах. У Варшаве 14.II.1641г. Уладзіслаў IV загадаў унесці ў кнігі вялікай канцылярыі ВКЛ, па просьбе Я.Р.Дзягілевіча, каралеўскі прывілей ад 14.III.1635г., якім пацвярджаліся і захоўваліся правы ўніяцкай царквы на належныя ёй архіяпіскапствы і манастыры.[16] Магчыма гэта сведчынь, што Я.Р.Дзягілевіч быў уніятам. Але галоўная каштоўнасць дадзенай метрычнай копіі заключаецца ў іншым: Я.Р.Дзягілевіч у абодвух выпадках, калі згадваецца яго імя і прозвішча, наззаны "шляхетным". Адсюль мы можам зрабіць выснову, што, па крайняй меры, да 14.II.1641г. прыналежнасць Я.Р.Дзягілевіча да шляхецкага стану не выклікала сумніву.

Разгляд справы аб пацверджанні шляхецтва полацкаму месцкаму пісару Я.Р.Дзягілевічу можна было б скончыць і прызнаць яе досыць рэдкім у сваім родзе прыкладам апісання самой працэдуры абгрунтаванага вяртання амаль страчаных станавых прывілеяў. На гэтым, аднак, каштоўнасць "Каўцыі" як крыніцы далёка не вычэрпваецца. "Каўцыя" з'яўляецца вартай увагі не толькі з пункта гледжання яе асноўнай мэты, але таксама таму, што ўтрымлівае некаторыя біяграфічныя дадзеныя пра Я.Р.Дзягілевіча і дае магчымасць, на жаль, фрагментарна, прасачыць лёс гэтага чалавека да 1644г. Значнасць гэтай інфармацыі ўзрастае яшчэ больш у выніку аднаго вартага ўвагі супадзення. У 1999г у "Беларускім гістарычным аглядзе" былі апублікаваны асобныя матэрыялы з актавай кнігі полацкага магістрата за 1656-1657гг., прысвечаныя падзеям вайны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай 1654-1667гг., падрыхтаваныя да друку М.Гардзеевым.[17] Між іншымі актамі звяртае на сябе ўвагу змешчанае ў дадатках пад нумарам тры паведамленне жонкі полацкага месцкага пісара, пані Фядоры Дзягілевіч - "Протестацыя пани Яновое Дягилевичовое, писаровое полоцкое о погроме неи от рати сталое в месте Виленском.", актыкаванае 17.VIII.1657г.[18] Дадзены дакумент дазваляе ўстанавіць некаторыя дадатковыя факты біяграфіі Я.Р.Дзягілевіча. Кароткі змест справы такі: ратуючыся перад маскоўскай навалай, Я.Р.Дзягілевіч, які, магчыма ў большай ступені хваляваўся за лёс сваёй сям'і і маёмасці, паколькі не належыў да прамаскоўскі настроенай групоўкі палачан[19], у 1654г. ад'ехаў у Вільню. Тут ён знаходзіўся разам з сям'ёй да пачатку штурма сталіцы ВКЛ, які пачаўся 8 жніўні 1655г.[20] Вымушаны ў чарговы раз уцякаць ад маскоўскага войска, пры пераправе праз Вілію Я.Р.Дзягілевіч быў схопле-

ны ў палон, а маёмасць яго была разрабаваная. Яго жонка - Ф.Дзягілевіч - вымушана была вярнуцца ў 1657г. з дзецьмі ў Полацк, нічога не ведаючы пра лёс свайго мужа.[21]

Такім чынам, дадзеныя "Пратэстацыі" у комплексе з матэрыяламі метрыкі ВКЛ дазваляюць скласці, канешне ж, не цалкам, біяграфію чалавека XVII стагоддзя, што, у прынцыпе, пры наяўным крынічным падмурку зрабіць вельмі цяжка, бо не кожны, нават вядомы дзеяч палітыкі ці асветнік таго часу, мае поўную біяграфію.

[1]Напр.: Лапо И.И.Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория(1569-1586).Опыт исследования политического и общественного строя.Т.I.Спб. 1901. і інш.

[2] Яковенко Н. Украпнська шляхта з кінця XIV-до середини XVIIст.(Волинь і Центральна Украпна).Кипв.1993.

[3] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588:Тэксты.Давед.Камент.Мн.,1989.С.123.

[4] Wisner H. Najjaniejsza Rzeczpospolita.Warszawa, 1978.S. 134.

[5] Juliusz Bardach, Bogusiaw Lesnodorski, Michai Pietrzak Historia ustroju i prawa polskiego.Warszawa.1998.S.192.

[6] Wisner H. Najjaniejsza Rzeczpospolita.Warszawa,1978.S.137.

[7] Тамсама.S.137-138.

[8] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, КМФ-18,воп. 1 ,спр.114,аа.394-395адв.

[9] НГАБ, КМФ-18,воп.1,спр.92,аа.242адв.-243.

[10] Тамсама.спр. 111 ,аа.547адв.-548адв.

[11] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588:Тэксты.Давед.Камент.Мн.,1989.С123.

[12] Urzkdnicy centralni i dostojnicy Wielkiego Ksikstwa Litewskiego XIV-XVIII wieku. Spisy. Opracowali Henryk Lulewicz, Andrzey Rachuba.Kyrnik,1994.S.46.

[13] Wisner H. Najjaniejsza Rzeczpospolita.Warszawa,1978.S.135.

[14] НГАБ,КМФ-18,воп.1,спр.113,аа.463-463адв.

[15] Тамсама.спр.119,аа.804-804адв.

[16] Тамсама,спр.107,аа.377-377адв.

[17] Беларускі гістарычны агляд.1999.Т.6.Сш.1-2.С.202-221.

[18] Тамсама.С.211-212.

[19] Гардзееў М.Ю.Полацкі магістрат у час вайны 1654-1667гг.//Весці НАНБ.Сер.гум.навук.2000.№3.С.70.

[20] Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654-1667.Мн.,1995.С.45.

[21] Беларускі гістарычны агляд.1999.Т.6.Сш.1-2.С. 211-212.

# ДА ПЫТАННЯ АБ СТВАРЭННІ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ Ў ПОЛАЦКУ

*Т.А.Джумантаева (Полацк)*

Стварэнне Краязнаўчага музея ў Полацку было справай не новай. Традыцыі музейнага будаўніцтва ў горадзе складаліся на працягу многіх дзесяцігоддзяў існавання езуіцкага калегіўма, акадэміі і кадэцкага корпуса. Факт існавання ў 2-ой палове 18ст. Музея езуіцкага калегіўма ў спецьяльна пабудаваным трохпавярховым корпусе добра вядомы.

Акрамя Музея езуітаў нешматлікія крыніцы згадваюць Музей піярскай вучэльні, Музей кадэцкага корпуса і Полацкі музей розных прадметаў лясной гаспадаркі (сяр. 19ст.). Названыя музеі існавалі не адначасова, а кожны з іх (акрамя музея розных прадметаў лясной гаспадаркі) ствараўся на базе і на месцы папярэдняга. Трэба адзначыць, што багатыя і змястоўныя калекцыі, сабраныя езуітамі, піярамі і кадэтамі, да пачатку 20ст. былі разрабаваны і, амаль поўнасцю, вывезены ў Санкт-Пецярбург, Маскву, Віцебск, Вільню і Варшаву. Таму гісторыя стварэння Краязнаўчага музея, якая пачалася ў 1918г., пачалася з нуля.

У снежні 1918г. быў падпісаны Дэкрэт Савета народных камісараў аб уліку, ахове і рэгістрацыі помнікаў даўніны і мастацтва. Бюро гарадоў

пры народным камісарыяце па асвеце разаслала звароты з мэтай збору звестак аб бягучай муніцыпальнай дзейнасці і развіцці культуры ў Расіі і за мяжой. На падставе дэкрэта і звароту аддзел народнай адукацыі Полацкага ўезднага выканкама выдаў пастанову, у якой гаварылася аб неабходнасці ў двухтыднёвы тэрмін зарэгістраваць помнікі мастацтва і даўніны. Дадзенай пастановай забаранялася без дазволу аддзела народнай адукацыі рабіць рамонты і рэстаўрацыю будынкаў, маючых гістарычную і мастацкую каштоўнасць.

У студзені 1919г. уездны аддзел народнай адукацыі прасіў валасныя аддзелы і саветы збіраць у маёнтках і ў прыватных асоб за ўзнагароду мастацкія каштоўнасці (карціны, статуі, гравюры, кнігі, прыборы, музычныя інструменты) для будучага музея. У лютым 1919г. прадстаўнікі аддзе ла правялі перапіс каштоўнасцей, што захоўваліся ў дамах заможных жыхароў Полацка. Аддзел адукацыі рыхтаваўся да стварэння музея пры народным доме асветы.

У чэрвені 1919г. на размову аб планах стварэння ўезднага музея ў аддзел адукацыі запрашаліся настаўнікі Парфірый Міхайлавіч Пяроўскі і Аляксей Сяргеевіч Еленеў. П.М.Пяроўскі, які па прычыне сталага ўзросту адмовіўся ўзначаліць справу стварэння музея, напісаў запіску аб тым, якім яму бачыўся будучы музей: "На первых порах своего существования музей мне представляется выставкой предметов из разных областей знания и искусства, из разных мест. По мере пополнения коллекций, тому или иному региону будут посвящены отдельные полки, затем шкафы, затем этаж и т.д. В конце концов, сильно разросшийся универсальный музей может быть развёрнут на несколько специальных музеев, хотя не исключается возможность существования одного обширного музея универсального характера наподобие Московского политехнического. Не исключается возможность закупки экспонатов на рынке. Некоторые предметы не откажутся отдать частные лица. Большую помощь могут оказать местные школы. Предполагается следующий штат: заведующий и 2-3 инструктора по специальностям: история с археологией. Естествознание с географией и, может быть, искусство; сторож и организатор посещений". Згаданы вышэй А.С.Еленеў ў верасні ўзначаліў музейна-выставачна-экскурсійную секцыю, якая была створана пры пазашкольным пададзеле Полацкага аддзела народнай адукацыі (сябры секцыі: С.С.Мацвееў, П.О. Дэйніс, П.С.Іваноў, Л.А.Багданаў, К.П.Лепетаў, Я.В.Голікаў, В.Г.Савіцкі, А.Ф.Пігулеўскі, Э.С.Пуцята, А.І.Рыбіцкі, В.П.Левіцкі, П.М.Пяроўскі, М.З.Стральцоў, С.С.Цы-

бульскі). На пасяджэнні секцыі было вырашана ствараць у Полацку народны прыродна-гістарычны музей (народный естественно исторический музей). Праз тры месяцы назва будучага музея змянілася і з верасня 1919г. пачалася падрыхтоўка да стварэння мясцовага музея старажытнасцяў і сучаснай культуры (местный музей древностей и современной культуры). Мэтай стварэння такога музея было агульнадаступнае пазашкольнае выхаванне і адукацыя.

Для будучага музея пазашкольны пададзел знайшоў памяшканне (трэці паверх дома №14 па вуліцы К.Маркса), але яно хутка было занята воінскімі часцямі. Для стварэння экспазіцыі музея быў складзены каштарыс, у які было ўнесена набыццё мастацкіх і навуковых прадметаў і музейнай мэблі (15 вялікіх шаф пад шклом, 15 вітрын і 75 тумб-падставак). Пытанне аб памяшканні для музея заставалася адкрытым. Пры абмеркаванні гэтага пытання часцей за ўсё згадваўся Сафійскі сабор нягледзячы на тое, што там прапаноўвалі адкрыць гарадскі тэатр і навуковы кінематограф. У 1922г. Сафійскі сабор быў перададзены праваслаўнай абшчыне.

Пачынаючы з чэрвеня 1920г. вялікі ўклад у справу стварэння музея ў Полацку ўнесла камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва. У гадавым вытворчым плане работ на 1921-1922гг. сябры камісіі на першае месца ставілі арганізацыю ў Полацку народнага музея з наступнымі аддзеламі: гісторыка-археалагічным, прыродна-гістарычным, наглядных дапаможнікаў, рэвалюцыйным. Яны планавалі пры музеі адкрыць хіміка-фатаграфічную лабараторыю, аўдыторыю са светавымі карцінамі, метэаралагічную станцыю, майстэрні. Відаць, што размова аб стварэнні музея ў камісіі ішла сур'ёзна і досыць прафесійна.

У склад камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва ўвесь час яе існавання (да 1924г.) ўваходзіў ганаровы грамадзянін нашага горада Іван Пятровіч Дэйніс. У фондах запаведніка захоўваецца яго рукапіс, дзе ён піша, што ў 1923-1924гг. быў адкрыты Краязнаўчы музей, які спачатку месціўся ў Сафійскім саборы, а потым быў пераведзены ў Лютэранскую кірху. Па нашых жа крыніцах пад 1923г. згадваецца толькі музей пры Полацкім педагагічным тэхнікуме.

Дарэчы, выкладчык гэтага тэхнікума С.Мялешка ў 1925г. быў абраны старшынёй Полацкага краязнаўчага таварыства, якое працягнула справу стварэння акругавага музея (у 1924г. Полацк адышоў да Беларусі і быў створаны Полацкі округ). Праўленню таварыства ўдалося атрымаць патрэбныя для першапачатковай работы сродкі і памяшканне пад музей.

Пастановай савета народных камісараў Беларусі ад 5 ліпеня 1926г. Сафійскі сабор быў абвешчаны дзяржаўнай маёмасцю і перададзены пад музей. Пасля яго рамонту праўленне таварыства пачало збіраць музейныя экспанаты. Дублеты некаторых музейных прадметаў былі атрыманы з Віцебскага аддзялення Беларускага дзяржаўнага музея. Сябрамі таварыства быў арганізаваны вайсковы аддзел, у якім мелася некалькі старажытных крамнёвых стрэльбаў, кінжалаў, пік і калекцыя куль перыяду напалеонаўскіх войн. У аддзеле нумізматыкі налічвалася дзве грашовыя калекцыі: манеты і папяровыя знакі. У аддзеле іканапісу мелася некалькі ўніяцкіх абразоў 18-19стст. І абразы, напісаныя мясцовымі мастакамі. Мастацкі аддзел складалі партрэты дзеччоў дамініканскага ордэна (60 адзінак), партрэты рымскіх пап і карціна Сальвадора Розы "Забойства пакутніка Стэфана". У аддзеле ручной працы былі прадстаўлены: узоры разьбы па дрэву полацкіх майстроў 17-18стст., слуцкі пояс, дыван ручной работы. У аддзеле палеаграфіі былі сабраны копіі старажытных полацкіх грамат і іншых дакументаў. У гістарычным аддзеле быў прадстаўлены ў якасці экспаната чэрап, заліты свінцом, што на думку наведвальніка павінна было быць сведчаннем здзекаў езуітаў над праваслаўнымі. Прыемнай нечаканасцю для сёняшняга дня стаў факт музеефікацыі ў 1926г. старажытнай муроўкі Сафійскага сабора з фрагментамі фрэскавага роспісу. Пры музеі была арганізавана невялікая бібліятэка (100 кніг), у якой меліся старадрукі (кірылічныя і лацінскія 16ст.). Сябры таварыства стваралі аддзел рэвалюцыйнага руху і марылі пра арганізацыю яшчэ некалькіх аддзелаў і пададзелаў: этнаграфічнага, мясцовай прыроды і грамадска-эканамічнага. У 1927г. музей быў пераведзены ў памяшканне Лютэранскай кірхі.

# КУЛЬТУРНЫЙ СУВЯЗІ ПАЛАЧАН (па выніках вывучэння пячной кафлі XIV-XVII стст.)

*Д.У.Дук (Наваполацк)*

Пячная кафля - прадстаўнічы від архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі, з'яўляецца аднachасова важкай археалагічнай крыніцай.

Вывучэнне шляхоў распаўсюджвання арнаментальных матываў полацкай кафлі дазваляе акрэсліць ролю знешніх культурных уплываў у развіцці дэкаратыўнага мастацтва. Аналіз рэчавага матэрыялу праведзены на падставе даследавання калекцыі полацкай кафлі, што захоўваецца ў фондах Нацыянальнага полацкага гістарычна-культурнага музея-запаведьіка і Нацыянальнага музея Рэспублікі Беларусь.

Упершыню на тэрыторыі Беларусі пячную кафлю пачалі вырабляць менавіта ў Полацку. Знойдзена яна пры даследаванні княсскага церама і датуецца па часе вырабу печы 1304 г. [7, 11]. Існуе меркаванне, што традыцыя вытворчасці кафлі была прынесена ў Полацк з нямецкіх земляў пры пасрэдніцтве Рыгі [1, 247], адбылося гэта ў выніку шчыльных кантактаў з выхадцамі з паўночнагерманскіх земляў (Любек).

Самая старажытная каробчатая кафля — тэракотавая, бязрамачная, з высокім рэльефам (гарэльефам). Існавала яна ад сярэдзіны XV ст. да першай паловы XVI ст.

Полацкая бязрамачная кафля падзяляецца на шэраг варыянтаў, па вызначэнню Л. Г. Панічавай — не менш чатырох. Гэта гарэльефы з выявамі людзей, драконаў, фантастычных і рэальна існуючых жывёл [8, 276-278, рис. 2]. Пры гэтым асобныя выявы скамарохаў, у т.л. і на рамачнай кафле першай паловы XVI ст. [2, мал. 3], маюць выразна ўсходнія рысы ў абліччы і дэталях адзення.

Асабняком сярод матываў полацкай кафлі вылучаецца выява рыцара [6, № 1515563]. Каштоўнасць знаходкі вызначаюць дакладна перададзеныя дэталі рыцарскага ўзбраення. Па часу ўжывання нагруднікаў з тапулем (т. зв."зброі бляхавай") гэтую кафлю можна аднесці да другой чвэрці XVI ст. Воін мае выразнае ўсходняе аблічча, яго валасы сабраны ў хвост на манер татарскіх вершнікаў. Не выключана, што гэты тып ваяра быў добра знаёмы палачанам (татары, напрыклад, выкарыстоўваліся ў замкавай залоге).

Распаўсюджванне ў Вялікім княстве Літоўскім у сярэдзіне XVI ст. рэнесанснай "партрэтнай" кафлі звязана з заходнееўрапейскім культурным уплывам. Партрэтныя выявы ў рэнесансных строях не адлюстроўвалі канкрэтных асоб, яны сімвалізавалі, перш за ўсё, гуманістычныя і рэфармацыйныя ідэі і гэтым тлумачыцца іх папулярнасць і шырокае распаўсюджванне ў гарадах Беларусі [5, 136-138]. Па звестках Р.Л. Разенфельдта, рэнесансная "партрэтная" кафля знойдзена і ў Полацку [9, 182], значыць, зроблена яна была не пазней 1563 г. (пачатак акупацыі Полацка Іванам IV). Трансфармацыя на мясцовай глебе заходнееўрапейскага ўплыву адзначана на рэнесанснай кафле з выявай жанчыны з рыбім хвастом, дзе вобраз марской дзевы накладаецца на вобраз русалкі згодна з ўяўленнямі палачан [2, 126-127].

Трэцяя чвэрць XVI ст. была не вельмі спрыяльным часам для развіцця рамесніцтва ўсходняга рэгіёна Вялікага княства Літоўскага ў выніку наступстваў Лівонскай вайны. Таму імклівае развіццё выяўленчага мастацтва полацкай кафлі звязана з апошняй чвэрцю XVI ст. Арнаментальныя матывы на рэчах канца XVI-пач. XVII стст. маюць прыкметы, характэрныя для рубяжа эпох. Выразнае аздабленне стыля барока накладаецца на рэнесансныя матывы, зводзячы апошнія да схематызму альбо пераўтвараючы іх у маньерыстычнай традыцыі. Маньерызм-гэта новы стыль еўрапейскага мастацтва, яшчэ не барока, але ўжо і не Рэнесанс. У Польшчу і ВКЛ гэты напрамак быў занесены ў сяр. XVI ст. і традыцыйна звязваецца з контрэфармацыяй і Трайдэнскім саборам (1563 г.). З пачатку XVII ст. і да 30-х гг. манера барока ў тэхніцы выканання канчаткова перамагае.

Вялікую цікавасць у гэтым плане прадстаўляе полацкая кафля з вывай мушкецёра. Большасць пласцін захавалася фрагментарна [6, кп-15, № 15638], адна кафля цэлая1. З вонкавага боку кафля пакрыта зялёнай палівай, толькі адзін кавалак паліхромны [6, кп-15, № 8918/8].

Постаць воіна са стрэльбай у руцэ ўпісана ў высокую паўцыркульную рамку, якая закрывае з бакоў усё зрокавае поле. У правай руцэ воін трымае стрэльбу. Адсутнасць выразу для пальца на шыйкі прыклада дазвэляе аднесці яе да тыпу ручной вагняпальнай зброі, якая ў Расіі мела назву пішчалі, а ў Заходняй Еўропе з XVI ст. вядома як карабін.

Адзенне воіна складаецца з курткі без рукавоў, з ляжачым паверх яе воратам і шырокіх штаноў-"марыналаў". Такую манеру апранацца заможная польская шляхта пераняла ад шматлікіх выхадцаў з Нідэрландаў-краўцоў, злотнікаў, разьбяроў, якія належалі да кракаўскіх цэхаў і арганізоўвалі-гвардзейскія атрады [11, 415-416]. На галаве воін насіў аздоблены пер'ем аксамітны капялюш, вядомы па захаванаму ўбору 1573 г. Мода на такі тып адзення была занесена ў Рэч Паспалітую дварам Генрыха Валуа і захавала свае істотныя рысы да 30-х гг. XVII ст. [11, 411]. Тып высакароднага ваяра быў добра вядомы палачанам з часоў Лівонскай вайны, не выключана, што ім мог быць галандскі альбо нямецкі гвардзеец.

Росквіт паліхромнай вытворчасці на Беларусі дасягнуў свайго найвышэйшага ўздыму ў канцы XVI-першай палове XVII стст. Вельмі папулярныя ў гэты час былі заглушаныя белыя глазуры, якія выкарыстоўваліся найчасцей як фон. Варта ўзгадаць пласціну з матывамі каванага металу (стылізаваныя галіны), якая ўжо страціла падабенства з каванымі вырабамі і больш нагадвае раслінны дэкор [6, кп-7, № 3913/13]. Аналагічная змены ў віленскім кафлярстве адбываліся ў канцы XVI ст. [4, 137]. У Польшчы звычай пакрываць рэльефны арнамент празрыстымі палівамі па белай аснове ўласцівы для прэлому XVI-XVII стст. [10, 134].

Асобнай групай полацкай кафлі прадстаўлены паліхромныя фрагменты гзымсаў з геаметрычным арнаментам. На адным з іх [6, кп-15, № 13509] была ўжыта пяцікаляровая палітра паліў. Па ўсіх прыкметах гэтую кафлю можна аднесці да канца XVI ст. Блізкі дэкор прафіляванай частцы пласціны сустракаецца на кафле з Мірскага замка [3, мал. 88, 11], замка ў Аджыконі [10, il. 30, 3].

Неабходным элементам кафляной печы з'яўляецца наверша. Адно з полацкіх навершаў канца XVII-пач. XVIII стст. [6, кп-15, № 13514], выкананае ў выглядзе ажурнай лілеі і пакрытае белай заглушанай палівай, знаходзіць прамы аналаг у сярэднявечным кафлярстве Кракава і Познані [13, 196|.

Такім чынам, традыцыя вырабу кафлі была прынесена ў Полацк з нямецкіх земляў і будаўніцтва кафляных печаў з гаршковай кафлі ў Полацку пачалося раней, чым у Польшчы і гарадах ВКЛ. З XV ст. вядомы пласціны, якія адлюстроўваюць выразны ўплыў з боку народнасцяў Усходу. З сярэдзіны XVI ст. пад уздзеяннем рэфармацыйных плыняў у Полацку вырабляецца "партрэтная" кафля.

Вытворчасць полацкай кафлі канца XVI-XVII стст. зазнала тыя ж змены і пераўтварэнні, якія характарызуюць заходне-і цэнтральнаеўрапейскае кафлярства. Традыцыя аздаблення пласцін развівалася пад уплывам заходнееўрапейскіх стыляў мастацтва: рэнесанса, маньерызма і барока. Аналіз малюнкаў паказвае, што многія матывы былі добра вядомы ў іншых гарадах Беларусі і Польшчы. Часам падабенства настолькі відавочнае, што гэта дае падставы сцвярджаць аб адзінай традыцыі, склаўшайся ў рамках Рэчы-Паспалітай. У прыватнасці, некаторыя тыпы арнамента (разеткі, лілеі, розныя віды гаметрычнага і расліннага дэкору) знаходзяць прамыя аналагі ў польскім кафлярстве. Тое ж тычыцца жанравай тэматыкі. Папулярныя ў Полацку выявы мушкецёраў даюць уяўленні аб густах заможнага шляхецтва, яго цесных сувязях з Заходняй Еўропай, у прыватнасці, з Нідэрландамі. Тым часам ніводная з вядомых нам груп арнаментальных матываў ні тыпалагічна, ні тэхналагічна не зведала ўплыву з боку ўсходняй (маскоўскай) культуры, гэта падцвярджае даследаванні Н.І. Здановіч, Л.Г. Панічавай, Р.Л. Разенфельдта і аўтара. Гэты факт вельмі паказальны, бо па матэрыялам усходніх гарадоў ВКЛ адзначаецца наяўнасць каля 10% пласцін з выразным уплывам маскоўскай керамічнай вытворчасці [14, 268]. Усё гэта дазваляе аднесці полацкае кафлярства XIV-XVII стст. да сферы ўздзеяння заходне- і цэнтральнаеўрапейскага дэкаратыўнага мастацтва, і ў той жа час падкрэсліць вялікую ролю мясцовай рамеснай традыцыі.

**Літаратура**

1. Дзярновіч А. Шляхі пранікнення кафлі на Беларусь: да пытання беларуска-нямецкіх кантактаў // З глыбі вякоў. Наш край. Вып. I.—Мн., 1996.

2. Дук Д.У. Полацкая каробчатая кафля XV-сярэдзіны XVI стст. // V Республиканская научная конференция студентов, аспирантов и магистрантов Республики Беларусь (НИРС-2000): Мат. конф. В 5 ч. Ч. 1.-Гродно, 2000.

3. Здановіч Н.І., Краўцэвіч А.К., Трусаў А.А. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка.-Мн., 1994.

4. Каталінас К. Вильнюсские пластинчатые изразцы XVI-XVII вв. с "кованым" орнаментом. // Древности Литвы и Белоруссии. -Вильнюс, 1988.

5. Кушнярэвіч А., Трусаў А. "Партрэтная" кафля XVI ст. // Спадчына, 2000, № 2.

6. Фонды Нацыянальнага полацкага гістарычна-культурнага музея-запаведніка, кніга паступлennяў.

7. Паничева Л.Г. Полоцкая архитектурно-декоративная керамика XIV—XVII вв. / / Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Ин-та археологии АН СССР. 1980. Вып. 160.

8. Паничева Л.Г. Изразцы и изразцовые печи позднесредневекового Полоцка // Советская археология. 1981, № 3.

9. Розенфельдт Р.Л. Белорусские изразцы / / Материалы и исследования по археологии СССР, М.,1969, № 169.

l0. Dbrowska M. Kafle i piece kaflowe w Polsce do kocca XVII? w.-Wrociaw, 1987.

11. Gutkowska-Rychlewska M. Historia ubioryw.-Wrociaw-Warszawa-Krakyw, 1968.

12. Historia sztuki Polskiej w zarysie. W III t. T. II, Sztuka nowoïytna-Krakyw, 1962.

13. Pitkiewicz-Dereniowa M. Material kaflowy. / / Pocztki i rozwyj starego miasta w Poznaniu w wietle badac archeologicznych i urbanistyczno-architektonicznych. - Warszawa-Poznac, 1977.

14. Ïemigala M. Belaruskaia kaflia / / Kwartalnik architektury i urbanistyki. T. XXXVI, zeszyt 3.-Warszawa, 1991.

[1] Захоўваецца ў прыватнай калекцыі палачаніна Аляксандра Салаўёва.

# ВИТЕБСКИЙ ГУБЕРНАТОР ИВАН СТЕПАНОВИЧ ЖИРКЕВИЧ И ЕГО МЕМУАРЫ

*Н.Жиркевич-Подлесских (Москва)*

В начале 40-х годов XIX столетия в Полоцк на постоянное жительство переезжает недавно вышедший в отставку военный губернатор Витебска - Иван Степанович Жиркевич (1789 - 1848)[1]. Назначенный на этот пост в 1836 году в сложное время присоединения униатов[2] к православной церкви, он оказался в самом центре экономических проблем и религиозных противостояний в крае, о чем, в дальнейшем, подробно рассказал в своих мемуарах, названные им "Записки Ивана Степановича Жиркевича". Они печатались в "Русской старине" (1874-76, 78 и 90-х годах) и принесли автору посмертную известность, вызвав интерес искренностью и непритязательностью рассказа очевидца и участника многих важных событий конца XVIII - первой половины XIX столетия. Просто и незамысловато ведет он свое повествование об Отечественной войне 1812 года, о заграничных походах русской армии, о выдающихся военачальниках, с которыми встречался - М. И. Кутузове, А. П. Ермолове, А. А. Аракчееве; о подробностях армейского быта и боевых действий; усадебной жизни; о губернаторстве в Симбирске и Витебске, своей неустанной борьбе с казнокрадством и взяточничеством... И через все воспо-

минания красной нитью проходит фанатическая преданность автора императору, отечеству и закону...

Имя И. С. Жиркевича включено в энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона, а как автор "Записок" - в биографический словарь "Русские писатели. 1800 - 1917 гг."

Страницы витебского периода "Записок" сохранили для потомков приметы жизни и бытовые подробности той эпохи, память о стихийных бедствиях в крае (наводнение в Дриссе, пожар в Полоцке), оценки деятельности бывшего ген.-губернатора края кн. Хованского и нынешнего - Дьякова, с которым Жиркевич служил, множество имен предводителей дворянства разных городов края и других государственных служащих; ряд страниц "Записок" посвящен деятельности полоцкого архиепископа Смарагда Крыжановского и встречам с ним; здесь же размышления автора об экономических проблемах губернии и путях выхода из кризиса для последующих руководителей.

"Мне было приятно слышать от губернатора (кн. Долгорукий.-Н.Ж.), - записал в дневнике в 1892 г. внук И. С Жиркевича Александр Владимирович Жиркевич[3], - доброе слово по адресу покойного моего деда. Он сказал, между прочим, что 9 лет губернаторствуя в Витебске, часто руководствуется записками деда и удивляется, на сколько дед был умен и тонко понимал условия и быт местного края".

Одной из задач, стоящих перед Жиркевичем, была необходимость разобраться в причинах экономического упадка в губернии и найти пути к улучшению жизни в крае. Он приходит к выводу, что таких причин несколько. Прежде всего, прекращение в 1808 г. торговли через Ригу с англичанами[4], неурожайные годы и нерегулярная уплата подати, которую несвоевременно или вовсе не платили помещики крупных поместий и арендаторы казенных имений.

Другой, и главной задачей, был деликатный вопрос присоединения униатов к православной церкви, которое правительство хотело провести осторожно и постепенно.

Две наиболее значительные темы проходят через все страницы воспоминаний витебского периода: проблема униатства " и еврейский вопрос, который неоднократно возникает на страницах "Записок". Здесь, где с давних пор проходила черта оседлости еврейского народа, ограниченного во многих своих правах, всегда были сложные проблемы взаимоотношения с коренным населением.

Обе эти темы могут быть выделены в отдельные исследования.

Несмотря на короткое пребывание И. С. Жиркевича на посту Витебского губернатора (1836 - 1838), он оставил о себе память как о человеке, столь непохожем на привычное представление о губернаторе, что спустя более полувека его внук А. В. Жиркевич, посетив Витебск, записал в дневнике:

"Посетив Витебск, я много слышал воспоминаний старожилов о моем деде. Несмотря на его вспыльчивость, о нем живет здесь добрая память. Витебск 25 ноября 1892 г.".

Сослуживец Жиркевича Э. Стогов, возглавлявший жандармскую службу Симбирска, в "Русской старине" в своих воспоминаниях (1903. № 4), почти целую главу посвятил Жиркевичу.

"Весьма часто я писал к шефу, - вспоминал Стогов, - что Жиркевич феномен между губернаторами. Писал, что Жиркевичу достанет управлять тремя губерниями, стоял за его благородную честность, неутомимость...".

<...> Приехав в Витебск 21 сентября 1836 г. (ст. ст.), И. С. Жиркевич уже на следующий день вызывает к себе членов губернского правления, большая часть которых по привычной халатности не явилась к сроку. Жиркевич, не дожидаясь, едет осматривать казенные заведения. По дороге он отмечает "на главных улицах и площадях заметную чистоту и опрятность, но зато в боковых улицах и переулках заразительная вонь и гнилость...". В тюрьме он "тут же сделал выговор смотрителю и прокурору, который также опоздал на встречу". Осматривая больницу, Жиркевич "выразил свое мнение с приличной строгостью, а возразившего ему смотрителя тут же арестовал, но по выходе из больницы возвратил ему шпагу". <...>

Знакомясь с вопросом присоединении униатов, Жиркевич собирал мнения чиновников. Тогда же он записал рассказ губернского предводителя из Яноволя Шадурского о тех методах, которыми пользовались некоторые священники при обращении униатов в православие:

"Витебские помещики большею частию католики, а крестьяне и другие обыватели частью только принадлежат католической церкви, а наиболее униатов. Я не буду утверждать, чтобы из числа католиков все вообще помещики равнодушно смотрели на то, что подвластные им крестьяне униатского исповедания присоединяются к православной церкви, но скажу утвердительно, что когда образовалось точное понятие, что правительство решительно положило это в своих расчетах к выполнению, тогда образованные и умнейшие из помещиков воздержались от малейшего

в этом отношении вмешательства, а предоставили все это (действию) тех мер, какие правительство само признает нужным указывать в этом. К нашим помещикам, по сие время, никто не обратился об этом предмете своевременно; православное же духовенство вдруг обратилось в селениях с резким требованием - не только униатов заставить (?) обращаться с духовными требованиями к православным священникам, но даже коснулось и католиков, объясняя, что многие из сих последних, по брачным союзам с униатами, вместе с ними должны присоединиться к православной церкви. Согласитесь сами, ваше пр-во, позволяет ли совесть чистым католикам быть строгими участниками в подобного рода принуждениях. Конечно, ежели бы нам была объявлена прямо воля самого Государя в этом смысле, - мы бы должны были и стали бы все беспрекословно повиноваться. Но, вникнув в дела здешней губернии, ваше пр-во, сами изволите удостовериться, что вообще этим жалобам православного духовенства, об упорстве будто бы помещиков и о противодействии мерам правительства по этому важному предмету, начало всегда возникало (?) от православных же священников (?). Первый приступ с их стороны всегда бывает одинаков; к архиерею, обыкновенно, явится неожиданно человек из какого - либо значительного селения, с просьбою о желании всех будто бы обывателей оного обратиться к православной церкви.<...> Епархиальное начальство таковую просьбу всегда принимает с жаром, немедленно относится к земскому начальству, извещает оное об отправлении в селение просителя особого православного священника, требует без малейшего промедления допустить православного священника в приходскую униатскую церковь и указывает полиции принять немедленно под покровительство всех обращающихся. Помещик, владетель имения, иногда вовсе даже не знает об этих распоряжениях, а православное духовное управление дополняет, что оно нисколько не имеет нужды предварять об этом помещика: церковь - де приходская, а не собственность помещика и не одни его крестьяне приписаны приходом к церкви. Православный священник, не упуская минуты времени, приезжает в селение, очень часто прежде даже прибытия туда чиновника земской полиции, входит, обыкновенно, в дом помещика и, в выражениях нередко далеких от приличия, объявляет ему причину своего наезда и от него требует содействия и настояния к открытию церкви. Вообще при всех подобных случаях, униатский священник скрывается, с умыслом или случайно, - этого решительно нельзя вдруг определить. Помещик иногда, испуганный внезапностью, и сам желал бы тот же час выполнить настояние прибывшего священника,

но двор его уже наполнен крестьянами, большею частию неимеющими не только желания присоединению, но даже и понятия, что от них требуют. Конечно, при этом не может быть совершенного спокойствия, иногда встречается и сопротивление; тогда тотчас возникают жалобы: крестьяне де бунтуют, помещик и униатский священник не только подстрекают бунтуоших, но даже научают их противодействию. Чиновник земской полиции, юдъехавший к этому случаю, всегда уже положительно обвиняется в пристрастии и потворстве католикам и очень часто отрешается от должности, а иногда и предается суду. Суд же всегда оканчивается совершенным его оправданием".

Такова была невеселая картина, нарисованная Жиркевичу человеком, который не понаслышке знал, какими методами иногда проводилось присоединение.

Иван Степанович много разъезжает по губернии,-быстро решая необходимые вопросы, а иногда и усмиряя возникающие волнения. Пути его маршрутов: Полоцк, Дрисса, Невель, Люцин, крепость Динабург, Режицы и др.

В 1833 г. на Полоцкую кафедру был назначен епископ Смарагд Крыжановский (1833 - 1837), где православного пастыря видели последний раз в 1662 г.

"Не только красивый, но можно сказать прекрасный собой мужчина, - так живописал И. С. Жиркевич архиепископа полоцкого, - свежих лет, более похожий на воинственного черногорца, нежели на смиренного владыку, он меня встретил и принял радушно, но с первых слов я заметил, что природный ум его не получил ни мало мальской полировки. В Витебске я составил себе идею, что он должен быть религиозный фанатик, но тут стк:)ыл, что и предписанным церковным правилам он подчинялся лишь наружно; два или три случая меня тотчас с ним ознакомили".

Вскоре отношения Жиркевича и архиепископа Смарагда осложнились. По мнению Жиркевича, последний, обладая силой характера, вмешивался в дела гражданских властей, оставляя за собой приоритет в решении разных вопросов. В "Записках" многие страницы отведены взаимоотношениям с архиепископом Смарагдом, цитируются обширные диалоги с ним, которые здесь за неимением места привести нет возможности. На страницах "Записок" сохранилось память о пожаре 1837 г. в Полоцке, во время которого выгорела центральная часть города:

"Едва я успел вернуться в Витебск и дал от себя назначение о прибытии моем на другую половину губернии, в Сураж, Велиж, Невель и Горо-

док, я получил эстафету из Полоцка, что там произошел пожар, истребивший более 200 домов, лучшую часть города. Это известие я получил на другой день начала пожара в 10 часов утра; а в 6 вечера я уже был в Полоцке. Пламя погубило уже строения, но на пепелищах во многих местах еще вспыхивало, и в мою бытность сгорел еще один дом. Я обошел лично все пространство, обнимавшее несчастный случай; там, где счел нужным, приказал поставить особые караулы от обывателей и полиции. При таком огромном несчастии, конечно, никакая сила, никакие распоряжения не могли совершенно отвратить оного, а потому ни шуметь, ни взыскивать с кого-либо за действия мне не приходится.

С 10 часов вечера и до трех утра я занимался размышлением и распоряжениями, какими средствами можно было пособить погоревшим. Прежде всего предположил я открыть на месте и по губернии подписку на сбор денег и припасов для прокормления беднейших. Подписав от себя 400 руб. ассигнациями, утром пригласил я на пожертвование, через полицмейстера, генерала Хвощинского, подписавшегося на 100 руб., и архиерея, давшего 50 руб. ассигнациями; к этому началу, до обеда от обывателей присоединилось еще до 1.200 руб. Предвидя это, я предположил составить особый комитет для направления и раздачи пособий <...>.

Для удовлетворения потерпевших, я поручил комитету прежде всего озаботиться, чтобы бедные все были размещены на один месяц, в виде постоя, без платы, по домам, уцелевшим от пожара. Затем, чтобы раздача пособия производилась не деньгами, но закупаемыми припасами, мукою, крупою и печеным хлебом <...>.

Еще в Симбирске Государь за обедом изволил мне сказать:

"Смотри, Жиркевич, твоя участь будет жить в Полоцке. Мы давно уже имеем в виду перемещение туда из Витебска, но генерал-губернаторы как-то этого не хотят и отстаивают; со всем тем я считаю, что тебе придется непременно туда переехать".

Это навело меня на мысль, что на обгорелых местах постройки должны производиться с особою осторожностью и осмотрительностью, и я без разрешения моего воспретил даже и временные постройки. Там, где прежде были подвижные лавочки, указал я устраивать их в приличнейшем размещении, но поставил на вид полицмейстера дозволение на это давать по одной лишь необходимости, стараясь, чтобы подвижных лавок было как можно менее, ибо мне хотелось непременно выбрать удобные городские лавки и обывателей заставить волею или неволею нанимать оные в прибыль городу. Немедленно написал я всем уездным предводителям, город-

ничим, о рассылке главным помещикам по губернии, письменно прося их о деятельнейшем участии в сборе пособий и высылке оных без задержки на имя учрежденного мною комитета. Утром, собрав местное купечество, лично убедил оное на подписку и внесение суммы.

Еще с вечера посылал я полицмейстера от себя спросить о здоровье Смарагда (уже извещенного о переводе его в Могилев) и о том, не обеспокоил ли его особенно пожар, который коснулся до стен монастырского строения, и спросить, дозволит ли он мне видеть его. Смарагд дал ответ:

"Я болен, перепуган, а губернатор во всем господин, что угодно, так пусть и делает".

Сочтя это за отказ и нежелание со мной видеться, я решился уже не заходить к нему, но поутру жандармский штаб-офицер, подполковник Певцов, придя ко мне, объявил, что Смарагд чрезвычайно расстроен и огорчен, и пеняет, что я его не посетил. Я тот же час взял шляпу и отправился к-нему. Он меня принял с сильнейшим чувством благодарности, можно сказать даже покорности, просил извинения, что не может мне по болезни заплатить визита, но при отъезде через Витебск будет у меня лично, для изъявления своего искреннейшего раскаяния за разногласия со мною в действиях. <...>

Теперь же, возвратясь в Витебск и в этот же день, по случаю обыкновенного у меня по пятницам сборища общества, собрав еще более 1.000 руб. на погоревших, - я в подробном донесении Государю изобразил все, что видел сам лично и какие приняты на месте меры. Далее дополнил, что все несчастные успокоены мною окончательно на целый месяц и не будут терпеть нужды, но что дальнейшую их участь предаю его благотворной деснице." <...>

Еще в первое посещение Полоцка, Жиркевич "отдал визит директору Полоцкого кадетского корпуса генерал-майору Хвощинскому, о действиях которого, по управлению корпусом, слышал следующее суждение: "это не отец воспитанникам, а нежная мать им всем". Летом, осмотря корпус, по приглашению батальонного командира Базилезского, я с восхищением вышел из заведения".

Заканчивая печатать "Записки" в 1890 г. редакция журнала "Русская старина" в небольшом послесловии отмечала, что"<...> неуживчивость и строптивость Жиркевича вытекали из чистейшего источника, именно - из неподкупной, фанатической честности, из преданности и любви к царю и отечеству. Этими свойствами характера покойного запечатлены его "Записки"... Вообще Иван Степанович один из ярко типичных пред-

ставителей энергичных, весьма сметливых и способных, честных и горячих служак Николаевского времени".

Родом из дворян Смоленской губернии, он в 5-ти летнем возрасте был отдан на военную службу (как часто было принято в дворянских семьях того времени) в Сухопутный шляхетский кадетский корпус. В 16 лет, только что выпущенный в жизнь, Иван Степанович сразу же принял участия в боях под Аустерлицем (тогда же он получил свой первый боевой орден св. Анны на шпагу), а затем и во всех заграничных походах 1805 - 1807, 1808, 1809 гг. Около трех лет Жиркевич был адъютантом гр. Аракчеева[5]. Отечественную войну 1812 г. Иван Степанович прошел от самого начала и до конца, окончив ее в Париже. За участие в Бородинском сражении был награжден орденом св. Владимира 4-ой степени с бантом, одним из самых значительных в то время. После войны недолгое время служил в департаменте военного министерства; затем помощником командира Тульского оружейного завода. В 1834 - 36 гг. был губернатором Симбирска

В Витебске Жиркевич вскоре нажил себе таких же недоброжелателей, как и в Симбирске. Не найдя общего языка с генерал-губернатором Дьяковым, человеком, по мнению Жиркевича, нерешительным и компромиссным, Иван Степанович неоднократно подавал прошение об отставке, но Николай I не принимал ее.

В 1838 году отставка, неожиданно для Ивана Степановича, была принята:

Тогда же, еще в Витебске, Иван Степанович начал свои "Записки", которые продолжил в Полоцке, переехав туда с семьей в начале 40-х годов[6], и закончив их за год до смерти. Умер Иван Степанович в 1848 году, в крайней бедности, от холеры, свирепствовавшей в городе. Через шесть недель умерла и неразлучная спутница его жизни Александра Ивановна (урожд. Лаптева). Оба были похоронены на "Красном" кладбище Полоцка. Могила не сохранилась.

[1] О Жиркевиче И. С. см.: биогр. сл. "Русские писатели. 1800 - 1917 гг.". М., 1992. Большая Российская энциклопедия. Т. 2. С. 271

[2] Униатская церковь признает основные догматы католической церкви при сохранении православных обрядов и подчиняется Папе Римскому. В результате присоединения белорусских земель к Речи Посполитой и после заключения в 1597 г. Брестской унии большая часть христиан этих

земель стали униатами. После раздела Польши в 1772 и 1793 гг., когда белорусские земли вошли в состав Российской империи, начался многолетний процесс присоединения униатов к православной церкви. Екатерина II старалась освободить униатов от влияния католицизма, покровительствовала православию; Павел I ввел снова подчинение униатов католической церкви; Александр I, восстановив Польшу, включил в ее состав и Белоруссию, а создание университета в Вильне и виленского учебного округа, во главе которого стоял кн. Адам Чарторыйский, привело к усилению влияния католицизма. Николай I, после подавления польского восстания 1831 г, упразднил многие католические церкви, монастыри и школы, были введены русские учреждения, русский язык сделался официальным, но в отношении присоединения униатской церкви правительство предполагало действовать осторожно и постепенно. Присоединение завершилось в 1839 г.

[3] Жиркевич А. В. (1857 - 1927), военный юрист, литератор, коллекционер, общественный деятель Северо-Западного края. В его обширном архиве, который находится в ОР Гос. музея Л. Н. Толстого (Москва), сохранилось немало страниц, имеющих отношение к истории и культуре Белоруссии. В ОР Гос. Публ. биб - ки (Петербург) (фонд Жиркевича) хранятся также материалы о канонике Сенчиковском, боровшемся за частичное введение в церковную службу родного языка, на котором говорило население данного региона. Об А. В. Жиркевиче см.: биогр. сл. "Русские писатели. 1800 - 1917 гг.". М. 1992. Т. 2. С. 269 - 271.

[4] "Проводниками этой торговли, - по мнению И. С. Жиркевича, - искони были евреи, и влияние их простиралось как на помещиков, так и на крестьян так далеко, что правительство решилось положить предел оному и с 1808 года евреи из селений были выведены все на жительства в города и местечки. Помещики же чрез это лишились своих привычных комиссионеров; казалось бы, собственно быт селянина должен был через это улучшиться: вышло же совершенно противное тому; тут только стали помещики утверждать, что витебский крестьянин в своих понятиях совершенно туп, ленив и ничем более не занимается как пьянством. В первом отношении замечание, может быть и справедливо, - крестьянин сам никогда не занимался промышленностью, а действовал, как и помещик, всегда посредством евреев. Мог ли он вдруг сделать навык и изыскать те извороты, которыми руководились евреи - факторы, и вот сельская промышленность по селениям внезапно и совершенно прекратилась. Касательно же другого упрека, отчего крестьянин мог и стал пьянствовать

более прежнего - корчмы где были, там и теперь существуют; вино, продаваемое в оных дешево, но тогда еще было дешевле, крестьянин часто за свои промыслы и произрастания тогда еще не получал и не платил денег, а обыкновенно вино заменяло ему уплату" ("Записки". 1890. Август. Ч. 4 С. 243.).

[5] Не зачеркивая отрицательных сторон характера и деятельности гр. Аракчеева, Жиркевич в "Записках'" рассказывает и о достоинствах графа, о которых современному читателю почти ничего неизвестно; "Честная и пламенная преданность Престолу и Отечеству, природный ум и смышленность, без малейшего, однако же, образования, честность и прямота - вот главные черты его характера. Но бесконечное самолюбие, самонадеянность, уверенность в своих действиях, порождали в нем злонамереннсcть и мстительность; в отношении же тех лиц, которые один раз заслужили его доверие, он всегда был ласков, обходителен и даже снисходителен". Далее Жиркевич пишет: "единственными заботами графа русская артиллерия была доведена до той степени совершенства, какой она себя показала во всех последних войнах".

[6] Точная дата пока не обнаружена.

# ЛЮДЗІ І ПАДЗЕІ ВЕТРЫНСКАЙ ЗЯМЛІ: ПОШУКІ І ЗНАХОДКІ

*В.Р.Карасёў (Ветрына)*

Полацкая зямля, і канкрэтна мая Ветрыншчына, вядома многімі цікавымі падзеямі і людзьмі. Знаходкі і даследаванні, з якімі хачу падзяліцца, тычацца імёнаў, лёс якіх звязаны з нашым краем і ў гісторыі якога павінны застацца.

Па-першае, у працяг вывучэння роду Корсакаў, як аднаго са старажытных на Полаччыне, і канкрэтна Рымскіх-Корсакаў, а менавіта Аляксандра Аляксандравіча Рымскага-Корсакава, што меў сядзібу ў Бяздзедавічах на Полаччыне, былой Ветрынскай воласці. Гэта вядомы дзяржаўны дзеяч Расіі, сваяк вялікага кампазітара Мікалая Андрэевіча Рымскага-Корсакава (1844-1908). З архіваў і даведнікаў было вядома, што А. Рымскі-Корсакаў, дваранін, праваслаўны, уладальнік больш за 1000 дзесяцін зямлі і 500 дзесяцік лесу, меў сядзібу стары Двор (былая веска ля Бяздзедавіч) і Бяздзедавічы, а нейкая Л.П.Рымская-Корсакава, дваранка, валодала сядзібай Дубраўка, фальваркам Мушына, Запруддзе і Ваўчкова з 450 дзес. зямлі і 112 дзес.лесу.[1]

Хто такі А.Рымскі-Корсакаў, хто яму Л.П. Рымская-Корсакава, якая ступень роднасці з кампазітарам Рымскім-Корсакавым? Безумоўна, вельмі

цікавымі былі пошукі, тым больш - гэта часцінка гісторыі маёй Ветрыншчыны.

Даволі працяглыя пошукі аказаліся плённымі. Сабраны ўспаміны больш 15 старажылаў Бяздзедавіч і Дубравак, вялася перапіска з музеямі ў Ціхвіне і С-Пецярбургу. З гэтай перапіскі адказаў на свае пытанні не атрымаў, але даведаўся, дзе шукацэ радаслоўную Корсакаў, і скора з Нацыянальнай бібліятэкі РБ атрымаў ксеракопію артыкула радавода аўтара Т.Рымскай-Корсакавай /часопіс "Музыкальная акадэмія", № 2, 1994/. Аднак адказаў на пытанне аб месцы ў радаводзе Аляксандра Рымскага-Корсакава зноў не было. І зноў пошукі, на гэты раз аўтара артыкула. Знайшоў у С-Пецярбургу, адкуль атрымаў адказы на мае пытанні, у тым ліку і працяг радаслоўнай 4 і 5 веткі.

Таццяна Уладзіміраўна - унучка вялікага кампазітара. Яна - дачка сына кампазітара Уладзіміра (1882-1970), які займаўся архівам бацькі, рыхтаваў матэрыялы для музеяў, а Таццяна Уладзіміраўна працягвае гэту справу, яна былы архітэктар, цяпер ёй 85 год, яна - аўтар дзвух кніг аб кампазітары.

Вось толькі цяпер, пасля лістоў Таццяны Уладзіміраўны і ўнучатгга пляменніка, уладальніка сядзібы Бяздзедавічы, які жыве ў Маскве, пасля звестак, знойдзеных у архівах, можна адказаць на пастаўленыя вышэй пытанні.

Аляксандр Аляксандравіч Рымскі-Корсакаў, 1850 года нараджэння, цверскі памешчык, закончыў Маскоўскі ўніверсітэт, служыў у Міністэрстве юстыцыі, Яраслаўскі губернатар з 1904 па 1906 г., шталмейстар (прыдворны чын 3-га класа, заведваў царскімі канюшнямі), член Сената - вышэйшага дзяржаўнага органа Расіі з часоў Пятра 1, член дзяржаўнага Савета ў 1915 г., сапраўдны тайны саветнік, адзін з аўтараў праекта Канстытуцыі Расіі (у 1914 годзе "Запіскі А.А.Р-Корсакава апублікаваў А.Блок), быў старшынёй "Усерасійскага Саюза рускага народа". У верасні 1917 года ў сваім маёнтку Бяздзедавічы ён быў арыштаваны, у 1918 г. эмігрыраваў, памёр у 1922 годзе, бяздзетны.

Як сведчаць архіўныя дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва ў 1905 г. ад Лепельскага павета (тады Ветрынская воласць была ў складзе Лепельскага павета) Аляксандр Р-Корсакаў выбіраўся ў члены Дзяржаўнага Савета. [2] А "Памятная кніга Віцебскай губерніі на 1898 г." сведчыць, што ён - ганаровы міразы суддзя Лепельскага павета.

"Памятная кніга Віцебскай губерніі на 1903г." сведчыць, што ён - ганаровы папячыцель Дубраўскага народнага вучылішча Ветрынскай во-

ласці (заснавана ў 1864 г.). Дарэчы, яго намаганнямі і быў пабудаваны новы будынак школы і царква ў в. Дубраўка.

Добрую памяць і канкрэтныя добрыя справы пакінуў у памяці маіх землякоў гэты дзяржаўны дзеяч.

Па просьбе Таццяны Уладзіміраўны я адправіў ёй здымкі захаваўшагася будынка сядзібы, царквы ў Бяздзедавічах, таксама пабудаванай А.Р-Корсакавым і незахаваўшайся ўжо вельмі прыгожай царквы ў в.Дубраўка. Цяпер стала вядома, што ўладальніцай в.Дубраўка была жонка гаспадара Бяздзедавіч Людміла Паўлаўна, прах якой пакоіцца на дубраўскіх могілках. Тут у царкве яе адпявалі ў прысутнасці вялікай колькасці генералаў-сяброў А.А.Р-Корсакава. Памятаюць старажылы і прыгожую капліčку на месцы яе пахавання, ад якой цяпер засталася толькі яма. Па сведчанню старажылаў сядзібу Бяздзедавічы наведваў і кампазітар, і ў парку гаспадара сядзібы гучаў аркестр, а жыхары наваколля збіраліся туды паслухаць музыку. Але падцвердзіць гэта дакументамі пакуль не ўдалося.

Другое вельмі вядомае на Віцебшчыне імя - гэта Аляксандр Максімавіч Семянтоўскі (1821-1893). Але я хачу адзначыць не заслугі гэтага вядомага археолага, этнографа і гісторыка, а другое. З энцыклапедычных даведнікаў і дакументаў вядома, што пасля выхаду на пенсію з 1882 г. ён жыў у сваім маёнтку Ражаншчына пад Полацкам, дзе і памёр ў 1893 г. (тады гэта Лепельскі павет, Ветрынская воласць). Па рэкамендацыі старшыні краязнаўчага фонда імя А.Сапунова Аркадзія Падліпскага я з вялікай зацікаўленасцю з 1999г. займаўся пошукам месца пахавання Семянтоўскага, аб якім няма ніякіх звестак у архівах і дакументах, ва ўсякім разе ў Віцебску і Мінску.

Ужо даўно няма в.Ражаншчына - цяпер гэтыя землі адышлі пад нафтаправод "Дружба" ля Наваполацкага завода "Палімір" у бок Бяздзедавіч. У гістарычным архіве Мінска знайшоў план дачы-маёнтка Ражаншчына на 1906 г., уладання С.А.Семянтоўскага - сына Аляксандра Сямёнавіча, які пакінуў сядзібу ў 20-х гадах ХХст. і па некаторых звестках жыў у С-Пецярбургу.[3] Разыскаў і запісаў больш дзесяці ўспамінаў жыхароў знесенай вёскі Ражаншчына, што жывуць цяпер ў Наваполацку, Фарынаве і іншых месцах. Пошукі даюць падставу сцвярджаць, што месца пахавання Семянтоўскага ўстаноўлена. На так званых "панскіх могілках" да гэтага часу захаваўся вельмі крануты часам каваны крыж вышынёй каля 170 см, часткова зламаны. Гэты крыж старажылы былой в.Ражаншчына добра памятаюць і сцвярджаюць, што мясцовыя жыхары на "панскіх могілках" не хараніліся, а гэта рабілі ў суседняй в.Траецкае.

Мы, як члены камісіі па захаванню гістарычнай спадчыны пры райвыканкаме, у канцы 2000г. наведалі гэтыя мясціны. Я паказаў месца сядзібы

Семянтоўскіх на беразе р.Ушача за 1,5-2 км ад упадзення яе ў Заходнюю Дзвіну, і месца пахавання Аляксандра Семянтоўскага. Цяпер гэта зарослшае хмызняком месца, стогадовае дрэва, пад якім упамянуты крыж. ГІройдзе яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў і месца гэта знікне зусім. У гэты год - год 180-годдзя з дня нараджэння А.Семянтоўскага, хачу паставіць пытанне: як нам, людзям, якім неабыякава гістарычная спадчына, арганізаваць абазначэнне гэтага месца, як захаваць яго для нашчадкаў, або перанесці астанкі вучонага ў Віцебск, дзе ён доўга працаваў. Галоўнае - захаваць памяць аб Семянтоўскім, імя якога доўгі час было амаль забытае. Як прыемна было паведамленне нашай абласной газеты за 9 кастрычніка 1999 года аб устаноўцы памятнага знака Аляксею Парфёнавічу Сапунову ў Віцебскім раёне. Такой увагі заслугоўвае і Аляксандр Семянтоўскі, прах якога пакоіцца на Полацкай зямлі.

І яшчэ. Можа і на захаваўшымся будынку-сядзібе А.А.Рымскага-Корсакава, што ахоўваецца дзяржавай, зрабіць памятную дошку з кароткімі звесткамі аб гэтым дзяяржаўным дзеячы, які пакінуў добрую памяць на Полацкай зямлі.

Лічу таксама важнай знаходкай у Полацкім архіве звестак і дакументаў пра вядомага маршала, двойчы Героя Савецкага Саюза Васіля Іванавіча Чуйкова. Знаходка тычыцца падзей 20-х гадоў, канкрэтна падзей савецкапольскай вайны, калі 43- полк, якім камандаваў Чуйкоў, ахоўваў мяжу на Полацкай зямлі, бо да вясны 1921 года савецкая дзяржава не мела пагранвойскаў. Знойдзены акт ад 3 красавка 1921 года здачы і прыёму тэрыторыі згодна з Рыжскім мірным дагаворам. Гэты акт быў складзены ў в. Арэхаўна, што побач з Ветрына, прадстаўніком польскага боку і па даручэнню савецкай дзяржавы старшынёй Ветрынскага рэвалюцыйнага камітэта ў прысутнасці камандзіра палка Чырвонай арміі В.Чуйкова і падпісаны ў тым ліку і ім. Дарэчы, з палка, якім камандаваў Чуйкоў, папаўняўся першы ваенна-міліцэйскі атрад.[4]

Не менш цікавай і важнай лічу ў сваёй краязнаўчай рабоце ўстанаўленне факта, што знакаміты юны абаронца Брэсцкай крэпасці Пеця Клыпа да вайны жыў у ваенным гарадку Ветрына і вучыўся ў Ветрынскай СШ. Сабраны матэрыял з архіва сям'і Пятра Сяргеевіча Клыпа, з архіна музея Брэсцкай крэпасці і фотаздымкі займуць дастойнае месца ў школьным музеі. Пасля публікашыі гэтых матэрыялаў "Полацкім веснікам" 23 лютага 2000г. ўнесена прапанова аб увекавечванні імя юнага абаронца ў г.п.Ветрына.

[1] Сапуноў А.П. Віцебск, 1906г... ст.184.

[2] НГА РБ, ф. 2508, воп.1, справа 2933,ст 184.

[3] НГА РБ, ф. 1437, воп.1, справа 10371

[4] Полацкі занальны архіў. Ф. 612, воп.1, спр.5, ст.4.

# КРАЯЗНАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК АДЗІН З НАПРАМКАЎ ПРАЦЫ ДАМОЎ РАМЁСТВАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ

*С.У.Касцюкевіч (Наваполацк)*

Апошняе дзесяцігоддзе XX стагоддзя для беларусаў вызначаецца не толькі тым, что стала мяжой тысячагоддзя, але і тым, што ў грамадскім, палітычным і культурным жыцці Беларусі адбываліся вельмі значныя змены.

У межах дадзенага даклада хацелася б закрануць некаторыя праблемы культурнай сферы, у прыватнасці, дзейнасць Дамоў рамёстваў. Цікавасць да нацыянальных культур, якая з'явілася ў канцы стагоддзя, прывяла до ўзнікнення такой з'явы як Дом (Цэнтр) рамёстваў. Разумеючы, што народныя мастацтвы і промыслы няўхільна выцясняюцца прамысловасцю і ўсведамляючы каштоўнасць народнага мастацтва дзяржава ўзяла на сябе ролю апекуна народных мастацтваў. Мэтай «апякунства» было забеспячэнне належнай абароны і падтрымкі дзяржавай народных мастацтваў, стварэнне умоў для захавання і выяўлення беларускім народам уласнай культурнай самабытнасці [1, 22]. Менавіта з гэтымі мэтамі былі створаны Дамы (Цэнтры) рамёстваў. Да стварэння падобных устаноў дзяржаўная

ўвага была скіравана ў гэтай сферы толькі на арганізаваныя на вытворчай аснове прадпрыемствы ў выглядзе фабрык мастацкіх вырабаў і не распаўсюджвалася на іншыя формы народнай творчасці, напрыклад, прыватную дзейнасць майстроў.

У 1991 годзе быў зарэгістраваны Беларускі саюз майстроў народнай творчасці [2, 47]. У гэтым жа 1991 годзе пачаў працаваць першы Дом рамёстваў у Глыбокім [3, 68], адным з напрамкаў дзейнасці якога стала краязнаўчая. Цікавым рэгіёнам з'яўляецца Віцебшчына, бо тут Дамы рамёстваў прыжыліся і набылі пашырэнне як нідзе ў рэспубліцы, таму гэты рэгіён і разглядаецца ў дакладзе. Прававая база падобных устаноў была падмацавана дзяржаўным Законам «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», дзе абвяшчалась, што пад «захаваннем» народных мастацтваў трэба разумець усебаковую ахову, абарону і зберажэнне:

– традыцыйнага народнага мастацтва як віда культурнай спадчыны;
– твораў народнага мастацтва як помнікаў нацыянальнай мастацкай культуры;
– гістарычна сфарміраваных цэнтраў аўтэнтычных народных промыслаў і сучасных мастацкіх вытворчасцяў, якія з'яўляюцца нацыянальным набыткам Беларусі;
– традыцыйных тэхналогій вырабу мастацкіх твораў на аснове ручных спосабаў вытворчасці і выкарыстання традыцыйных матэрыялаў;
– традыцыйнага асартымента вырабу народных промыслаў і іх высокай мастацкай якасці;
– этнічна-самабытнай стылістыкі твораў народнага мастацтва і вырабаў промыслаў;
– разнастайнасці мясцовых формаў, варыянтаў народнага мастацтва, усіх яго рэгіянальных і лакальных асаблівасцяў;
– усёй відавой разнастайнасці традыцыйных беларускіх мастацкіх рамёстваў;
– традыцыйнага механізму перадачы і прадаўжэння традыцый, прыёмаў рамяства [1, 23].

Калі супаставіць выкладзеныя пазіцыі з дзейнасцю Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў, можна зрабіць выснову аб тым, што яны добра ўпісаліся ў дзяржаўную канцэпцыю развіцця народных рамёстваў. Гэтыя культурныя ўстановы ажыццяўляюць краязнаўчую дзейнасць па наступных 2-х асноўных напрамках: 1. вывучэнне матэрыяльнай культуры асобных рэгіёнаў;

2. рэканструяванне, захаванне і адраджэнне некаторых відаў народных мастацтваў.

Паколькі адным з асноўных метадаў краязнаўства лічыцца збор інфармацыі [4, 257], то характарызуючы дзейнасць Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў, можна сказаць, што яны займаюцца збіраннем прадметаў матэрыяльнай культуры.

У палажэнні «Аб Цэнтры (Доме) рамёстваў» мэты акрэслены наступным чынам:

- падтрымка і стварэнне ўмоў для натуральнага існавання і аднаўлення нацыянальных рамесніцкіх традыцый у іх нацыянальна-самабытных формах, пошук і раскрыццё ўнікальных талентаў;
- кваліфікаванае збіранне, надзейнае захаванне, класіфікацыя і сістэматызацыя традыцыйных рамёстваў;
- адраджэнне традыцыйных унікальных тэхналогій, вытворчасць вырабаў паводле старадаўніх мясцовых узораў і распрацоўка новых тэхналогій;
- захаванне ўнікальнага асяроддзя натуральнага існавання рамёстваў;
- прапаганда і распаўсюджанне лепшых узораў беларускіх рамёстваў і г.д. [5, 12].

Рэалізуючы пастаўленыя мэты Дамы рамёстваў ажыццяўляюць краязнаўчую дзейнасць на пэўнай тэрыторыі па даследванні гісторыі мастацкіх рамёстваў У кожнай установе створана своеасаблівая «картатэка» майстроў, якія працавалі і працуюць на дадзенай тэрыторыі, вывучаецца дзейнасць майстэрскіх дынастый, рамесніцкіх цэхаў і арцелей. Так, напрыклад, супрацоўнікамі Глыбокскага Дома рамёстваў сабраны матэрыял пра творчасць майстэрскіх дынастый Сакалоўскіх, Скрагаў, Зайкоўскіх, Зарэмбаў і інш., створана картатэка. Браслаўскім Цэнтрам рамёстваў праведзена вывучэнне дзейнасці ткацкага цэха ў Опсе. Вядзецца Дамамі рамёстваў праца па збору калекцый вырабаў народных майстроў. Збіраюцца ткацкія, ганчарныя, драўляныя вырабы Актыўна наладжваюцца кантакты з мясцовым насельніцтвам, у рэканструкцыі твораў старажытнага мастацтва выкарыстоўваюцца апісанні мясцовых старажылаў.

Узнікае пытанне аб некаторым перакрыжаванні дзейнасці Дамоў рамёстваў з іншымі культурнымі ўстановамі, напрыклад, музеямі. Аднак, нічога дрэннага тут няма, наадварот - ідзе больш глыбокае вывучэнне народнай культуры. Пры Доме рамёстваў могуць існаваць творча-вытворчыя падраздзяленні і грамадскія аб"яднанні (цэхі, майстэрні, гурткі, выставач-

ная зала, салон продажу мастацкіх вырабаў, інфармацыйны цэнтр, навукова-даследчая лабараторыя, бібліятэка, кіна-, фота-, фона-, відэаархіў і інш. падраздзяленні, якія адпавядаюць статутным мэтам і задачам).

У адраджэнні народных мастацтваў як з'явы традыцыйнай культуры могуць быць выкарыстаны прынцыпы рэканструкцыі, музеефікацыі аб"ектаў і помнікаў, актуалізацыі на новай сацыякультурнай аснове гістарычных традыцый мінулага, уключэння іх у сучасны кантэкст культурных працэсаў нацыянальнага адраджэння і эканомікі, развіцці турызму [1, 24], што і рэалізуецца ў дзейнасці Дамоў рамёстваў ужо дзесяць гадоў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Лабачэўская В. Прынцыпы дзяржаўнай культурней палітыкі і азначэнне паняццяў у галіне народнага мастацтва, промыслаў і рамёстваў // Веснік Бел. Інстытута праблем культуры. 1993. Вып.1, с.20-36.
2. Рамяство. Ад прадзедаў - нашчадкам. Круглы стол // Мастацтва. 1996. №3, с.46-48.
3. Лабачэўская В. Дрэва народнага мастацтва жыве // Мастацтва. 1997. №1, с.67-68.
4. Трэпет Л. Краязнаўства / Энцыклапедыя гісторыі Беларус: у 6 т. Т.4. Кадэты-Ляшчэня / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э.Жакевіч. - Мн.: Бел. Эн., 1997. - С. 257-260.
5. Палажэнне аб Цэнтры (Доме) рамёстваў // Культура, 2000. - №8. - С.12.

# КРАЯЗНАЎЧЫ РУХ НА ПОЛАЧЧЫНЕ Ў 20-я гг. ХХст.

***В.Д.Краско (Полацк)***

Цяжка глядзець раўнадушна на пажоўклыя старонкі архіўных дакументаў, старадаўнія кнігі ў скураных пераплётах, археалагічныя і этнаграфічныя прадметы. За гэтымі гістарычнымі помнікамі стаяць не толькі
людзі, якія калісьці стварылі іх, але і тыя, хто старанна і беражліва збіраў увесь, комплекс матэрыялаў па гісторыі нашага краю. Але далека не ўсім людзям уласціва адчуваць сваю прыналежнасць гісторыі. Сучаснасць з яе штодзённымі праблемамі і клопатамі здавалася адзінай усепаглынальнай рэальнасцю. Менавіта таму сёння мы звяртаем сваю ўвагу на краязнаўцаў-аматараў, якія вывучалі сваю бацькаўшчыну.

Краязнаўчая работа на Полаччыне вялася яшчэ на пачатку ХХст. Канцэнтравалася яна вакол розных органаў перыядычнага друку, дзе змяшчаліся анкеты для даследавання, друкаваліся краязнаўчыя артыкулы. Аўтарамі іх былі педагогі Полацкага кадэцкага корпуса Даўгоў І.І., Марэль А.К., Кірпічоў Л.Л. і іншыя.

У гады першай сусветнай вайны Полацк трапіў у кругаварот ваенных дзеянняў. Гэта найгоршым чынам адбілася на стане яго эканамічнага, сацыяльнага, культурнага развіцця. Зразумела, што ніякай сур'ёзнай краязнаўчай працы ў гэтыя часы не вялося. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі краязнаўчы рух шырока разгарнуўся на Беларусі, бо ўрад разумеў, што

без усебаковага пазнання краю немагчыма ніякае будаўніцтва 25 ліпеня 1918 года мастацка-археалагічны пададдзел аддзела народнай адукацыі Заходняй вобласці звярнуўся да навучэнцаў з заклікам: "Организуйтесь, создавайте общества, кружки защиты памятников искусства, старины, архивов и пр." [7,22]. У Полацку пачалі стыхійна ўзнікаць краязнаўчыя гурткі, якія ствараліся ў школах. Члены гурткоў, куды ўваходзіла моладзь, імкнуліся да даследчай працы наогул і, асабліва, да вывучэння свайго краю. Вясной 1920 года сфарміраваўся гурток аматараў вывучэння даўніны і гісторыі края, у склад якога ўваходзілі настаўнікі і вучні мясцовых педагагічных навучальных устаноў. Ініцыятарамі стварэння гуртка былі настаўнікі Пяроўскі П.М., Дэйніс П.О., Еленеў А.С. Быў складзены праект статута таварыства вывучэння мясцовага краю, дзе вызначалася асноўная мэта - аб'яднанне ўсіх культурных сіл для вывучэння і аховы помнікаў даўніны і мастацтва ў межах Полацкага павета [2, 2-4]. У праекце ставіліся задачы: 1. Вывучэнне мясцовага краю ў этнаграфічных, прыродазнаўчых, гісторыка-археалагічных, сацыяльных і прамысловых адносінах. 2. Азнаямленне шырокіх мас з вынікамі работы метадам чытання лекцый і правядзення экскурсій па гістарычных месцах. [2, 2-4]. Членамі таварыства маглі быць усе грамадзяне, якія "готовы приложить свой труд к изучению местного края". [2,3]. Кіраўнікі гуртка звярнуліся да аддзела народнай адукацыі з просьбай прызнаць з аднаго боку, легальнее існаванне, а з другога - яго фінансаванне. Да статута быў дададзены ліст Пяроўскага П. "К организации музея". Па сутнасці сваей гэта быў праект будучага музея. Не паглыбляючыся ў дэталі праекта, бо тэма гэта асаблівая, абмяжуюсь толькі пералікам асобных пытанняў, якія спрабаваў вырашыць аўтар: якім павінен быць музей, дзе ўзяць экспанаты, унутраная арганізацыя музея, колькасць супрацоўнікаў, абсталяванне і іншае. [5,15]. Па незразумелым прычынам аддзел народнай адукацыі не пайшоў насустрач. Магчыма падставу для адмовы патрэбна шукаць у наступных радках: "...признать это несвоевременным и особенно теперь, когда общественная мысль должна работать в духе изучения не старых, а новых социалистических наук". [5,15]. Кіраўнікі гуртка вырашылі пакінуць да часу ажыццяўленне сваіх ідэй. Але не прайшло і двух тыдняў, як у пачатку чэрвеня выйшла распараджэнне аб абавязковым заснаванні камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва і гурток быў прызваны тым жа аддзелам для жыцця для тых жа задач толькі пад новай назвай.

Краязнаўчы рух у грамадскім і культурным жыцці беларускай правінцыі займаў усе большае месца. Ствараўшыяся паўсюдна розныя па мас-

штабах краязнаўчыя таварыствы і гурткі /ад акруговых да павятовых і сельсавецкіх/ мелі агульныя задачы: вывучэнне роднага краю, захаванне помнікаў прыроды і культуры, шырокае распаўсюджванне ведаў аб "малой Радзіме". [1,33]. У Полацку паралельна з работай камісіі працавалі розныя вучнёўскія гурткі пры педтэхнікуме і лестэхнікуме на чале з Вязоўскім І.О., Спіцэвічам В., Дэйнісам І.П., Галіноўскім З. Яны ставілі сваёй мэтай прапаганду ідэй краязнаўства сярод насельніцтва. Члены гурткоў збіралі і запісвалі этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы, рабілі фотаздымкі, замалёўкі. Шпаркія тэмпы развіцця краязнаўчага руху намагалі надання яму пэўных арганізацыйных форм. Гэта функцыя была ўскладзена на Цэнтральнае бюро краязнаўства /ЦБК/, утворанае 1 студзеня 1924 года на правах пастаяннай камісіі Інстытута беларускай культуры. З самага пачатку існавання ЦБК разгарнула актыўную працу. На першым пасяджэнні ЦБК было пастаноўлена: выявіць мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі, апрацаваць нармальныя статуты для іх, заснаваць краязнаўчую кансультацыю і г.д. Былі зарэгістраваны і падзелены на тры тыпы /акруговыя таварыствы, раённыя таварыствы і гурткі/ усе краязнаўчыя арганізацыі БССР. У сакавіку 1925 года пачало сваю дзейнасць Полацкае краязнаўчае таварыства, члены якога звяртаюцца ў Полацкі акружны выканаўчы камітэт з просьбай зацвердзіць статут. Асноўная мэта стварэння таварыства - усебаковае вывучэнне Полацкага округа ў гістарычных, эканамічных, геалагічных і іншых адносінах, а таксама навуковая распрацоўка розных пытанняў, распаўсюджванне адпаведных звестак і абуджэнне інтарэсаў да задач краязнаўства ў грамадскім асяроддзі. [3, 203-205]. Членамі таварыства маглі быць: 1. Сапраўдныя члены - грамадзяне, якія працавалі ў галінах, пералічаных вышэй. 2.Ганаровыя - грамадзяне, якія вядомы сваімі працамі ў дадзенай галіне. 3. Супрацоўнікі - грамадзяне, якія прымалі ўдзел у рабоце таварыства. [33,204]. Статут быў зацверджаны 2 чэрвеня 1925 года. Старшынёй праўлення таварыства стаў І.П.Дэйніс, якога змяніў на гэтай пасадзе выкладчык педагагічнага тэхнікума С.Мялешка. Гарадская арганізацыя складалася з наступных секцый: гісторыка-археалагічнай, этнаграфічнай, сельскагаспадарчай і прамысловай, прыродазнаўчай, яўрэйскай і польскай. Апрача таго, існавалі камісіі па ўкладанню краёвага слоўніка, па вывучэнню вытворчых сіл Беларусі. [5,34]. Актыўна дзейнічалі гісторыка-археалагічная і прыродазнаўчая секцыя, вынікам працы якіх з'явіўся збор калекцый. Раённыя краязнаўчыя таварыствы з'яўляліся філіяльнымі адцзяленнямі акруговага краязнаўчага таварыства. З раённых арганізацый найлепш працу паставіла Асвейс-

кае раённае таварыства краязнаўства, якое арганізавала музей, сабраўны досыць цікавыя экспанаты, і вяло планавае абследаванне раёну. Сталую працу распачалі Валынецкае і Вульскае раённыя таварыствы, пачалася праца ў Ветрынскім і Вушацкім раёнах. Сувязь паміж акруговым праўленнем і раённымі арганізацыямі была надта слабая. У Полацкім акртаварыстве заўважаўся недахоп падрыхтаваных супрацоўнікаў, якія маглі б непасрэдна кіраваць працаю секцый. У гэтым жа годзе ў Полацку пачаў выходзіць неперыядычны зборнік "Полотчина", у якім друкаваліся розныя краязнаўчыя матэрыялы па гісторыі округа.

На першым усебеларускім краязнаўчым з'езде, які адбыўся ў Мінску ў лютым 1926 года, яго ўдзельнікі прынялі пастанову аб стварэнні музея ў кожнай краязнаўчай арганізацыі. На з'езде падкрэслівалася, што ўзнікненне музея - натуральны вынік працы па вывучэнню мясцовага краю. Менавіта ў ім павінны былі захоўвацца і дэманстравацца сабраныя матэрыялы па гісторыі, прыродзе і гаспадарцы дадзенай мясцовасці. У 1926 гэдзе больш разнастайнымі сталі формы краязнаўчай працы, вынікі якой відавочна з'явіліся ў стварэнні нарэшце ў Полацку краязнаўчага музея. Гэты музей пачаў дзейнічаць пад кіраўніцтвам вядомага гісторыка і краязнаўцы С.Мялешкі ў будынку Сафійскага сабора. Стварэнне музея - вялікая заслуга краязнаўчага таварыства.

1928-1929 гады - час найвысшага ўздыму краязнаўчага руху на Полаччыне. Краязнаўцы актыўна збіралі і фіксавалі матэрыялы па гісторыі Полаччыны, клапаціліся аб спадчыне, вялі летапіс горада, дапамагалі вучоным у іх рабоце, прымалі ўдзел у археалагічных і этнаграфічных экспедыцях па Полацкай акрузе [6, 19].

**ЛІТАРАТУРА**


1. Беларускія музеі. Гісторыя. Хроніка. Сучаснасць. Мн., 1998.
2. Занальны дзяржаўны архіў у г.Полацку /ЗДА/, ф.54,воп.1, спр.341.
3. ЗДА, ф.104, воп.1,спр.51.
4. ЗДА, ф.П2, воп.1,спр.70.
5. Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Полацк, 1993
6. Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Полацк, 2000
7. Советское законодательство о памятниках истории и культуры. Сборник документов и материалов /1917-119972/. Мн.,1972.

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ ЭРОТЫКА Ў МАЛАДЗЁВАЙ СУБКУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ ПАДДЗВІННЯ /па фальклорных і этнаграфічных матэрыялах XIX-XX стст./

*У.Лобач*

Негледзячы на амаль 200-гадовы вопыт вывучэння народнай культуры, беларуская этнаграфія /этналогія/ так і не здолела стварыць цэльны вобраз традыцыйнай супольнасці, паколькі адныя тэмы лічыліся прыяры тэтнымі для доследаў, другія - другаснымі, а шэраг з іх папрост табуяванымі. Да ліку апошніх можна аднесці і тэму сексуальных адносінаў /сексуальнасці і эратызму/ у традыцыйнай культуры.

У XIX ст., калі ў буржуазным грамадстве адбываецца інтымізацыя сексуальнасці і ўсталёўваецца жорсткі сацыяльны кантроль над яе знешнімі праявамі, "старажытныя сялянскія звычаі сталі... праблематычнымі, іх пачалі адмаўляць, асуджаць ці саромецца" [1,142]. Адпаведна - і этнографы XIX -п.XXст. свядома ігнаравалі "непрыстойную " тэму сялянскай эротыкі.

У савецкі час ужо адно толькі прынцыпы "маралі будаўніка камунізму" выключалі магчымасць даследавання эратычныга коду традыцыйнай

культуры. Словы "секс", "сексуальнасць", "эротыка" практычна з'яўляліся сінонімамі скрайнее /жывёльнае/ распусты, пажадлівасці, пахабства ды псіхалагічных вычварэнняў на гэтай глебе. Паказальна, што нават у акадэмічным выданні [Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн.,1989] адсутнічае вызначэнне такой дысцыпліны як "этнасексалогія", што плённа развіваецца ў краінах Захаду амаль стагоддзе [2,308-309]. На вялікі жаль, істотных зрухаў у вывучэнні традыцыйнай эротыкі не адбылося і ў пасавецкі час.

Аднак між тым, даследаванне ўсяго комплексу міжполавых адносінаў у традыцыйнай супольнасці мае надзвычай важнае значэнне, бо "немагчыма зразумець лад жыцця грамадства, не ведаючы асаблівасцяў сексуальных поводзінаў складаючых яго індывідаў і таго, як гэтыя паводзіны і самі полавыя адрозненні асэнсоўваюцца і сімвалізуюцца ў культуры" [1,34-35].

Пры гэтым, трэба мець на ўвазе адну істотную акалічнасць, якую акрэсліў М.Эліадэ ў дачыненні да людзей "традыцыйнага" і "індустрыйнага" грамадстваў: "Для сучаснай свядомасці фізіялагічны акт /харчаванне,-полавы акт і т.д./ -гэта звычайны арганічны працэс... Але для "прымітыўнага... чалавека падобны досвед ніколі не расцэньваўся як толькі фізіялагічны. Ён быў ці мог стаць для яго нейкай "таямніцай", далучэннем да святарнага" [3,19]. Адсюль і "полавае жыццё...носіць рытуальны характар, а значыцца прыпадабняецца як касмічным з'явам /дождж, апладненне/, так і боскім актам /гіерагаміі Зямлі і Неба/" [3,106].

У міфілагічнай /постміфалагічнай/ свядомасці "полавы акт - сінонім і праваобраз усялякай дзейнасці, значэнне якой перадаецца дзеясловам "рабіць" і які дапушчае наяўнасць такіх элементаў, як актыўнасць, воля, магутнасць, улада..." [2,95].

Прынцып выяўлення "эратычнага" /сексуальнага/ у культуры "фальклорнага" тыпу, мае грунтам "некаторыя універсальныя значэнні, агульныя для ўсіх народаў і моваў: чэляс і мужчынскі пачатак увогуле пазначаюцца падоўжанымі, цвёрдымі рэчамі, а ўлонне і жаночы пачатак - круглымі, авальнымі ці ўвагнутымі. Словы і метафары, што азначаюць чэляс, пазначаюць актыўны, суб'ектыўны пачатак, а таксама інструментальны сродак дзейнасці /прылады працы, музычныя інструменты, зброя/. Насупраць, улонне часцей апісваецца як пасіўны пачатак, пустата, упадзіна: начынне, стоўплішча, натуральная адтуліна /дзірка, яма/ ці нейкая абмежаваная частка прасторы /пакой,крэпасць/"[1,95].

Аналіз беларускіх фальклорных тэкстаў выяўляе наступную заканамернасць: тая ж самая сімволіка, якая апісвае міжполавыя дачыненні, мае,

як бы 3 узроўні прачытання /ступені "празрыстасці"/. Найменш "празрыстая" яна ў межах маладзёвай субкультуры; падчас пераходу з аднаго жыццёва-сацыяльнага статусу ў другі (Вяселле) эратызм робіцца боль "адкрыты" і "чытабельны" і, нарэшце, эратычна-сексуальная семантыка "дэшыфруецца" максімальна магчыма ў акцэнтаваных, эмацыйна-смехавых формах падчас "Радзінаў", калі эратычная сімволіка, агучаная ў песнях і жартах, ёсць не што іншае, як знакавае ўвасабленне ўласнага сексуальнага вопыту кожнага з прысутных без выключэння.

Прадметны зварот да этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў Беларускага Паддзвіння палягае перадусім у шэрагу рэгіянальных асаблівасцяў і наяўнасці палявых матэрыялаў (экспедыцыі ПДУ 1995-2000гг.) па азначанай тэме, што, аднак, прынцыпова не выключае іх з агульнай палатніны беларускай традыцыйнай культуры.

1. "Праграмаванне" сексуальнасці чалавека (як адной з праяваў ягонай сацыяльнасці) адбывалася адразу пасля яго нараджэння. Так, на Віцебшчыне лічылі, што "калі радзілася дзяўчынка, то яе трэба "прыймаць" у мужчынскія нагавіцы і абавязкова бацькавы, каб яе любілі мальцы, а хлопчыка трэба "прыймаць" у жаночую кашулю і абавязкова ў кашулю маці, каб яго любілі дзеўкі" [4.5]. Пупавіну пераразалі на адлегласці трох пальцаў ад перавязі, бо іначай, калі пупавіну адрэзаць бліжэй, то ў хлопчыка полавы член будзе занадта кароткі, а дзяўчынка будзе вельмі пажадлівай [5, 264-265]. На Вушаччыне карміць грудзямі падчас купання, асабліва хлопчыка, забаранялася, бо дзіця вырасце распусным [6,129].

2. "Нормай" пры фізічным выспяванні падлеткаў (асабліва дзяўчынак) лічылася адпаведнасць разумовай і фізіялагічнай спеласці. "Нявеста лічыцца спелаю, калі яе каса (увасабленне розуму.-У.Л.) дарасла да паяса (увасабленне цялеснага "нізу", дзетародных органаў.-У.Л.) [7,306]. Адхіленне ад нормы, г.зн. занадта ранняе ці запозненае фізічнае развіццё азначалі нешанцунак у сямейным жыцці: у першым выпадку дзяўчына позна выходзіла замуж : мусіла пакутваць у шлюбе і нараджала недаўгавечных дзяцей, у другім - была добрай гаспадыняй, але бяздетнай [8,47]. "Анармальнасць" у развіцці магла карэктавацца з дапамогай разнастайных прыёмаў кантактнай і імітатыўнай магіі [8,47-48,264].

3. Пры дасягненні паўналецця (16-19), моладзь уступала ў перыяд т.зв. "гульні", падчас якой асноўная задача палягала ў стварэнні патэнцыйных шлюбных пар пасродкам абрадавых гульняў і іншых

формаў рытуальных (рытуалізаваных) паводзінаў. Перыяд "гульні" працягваўся ў сярэднім ад 1 да 5 гадоў для абодвух полаў [9,234], пасля чага чалавек патрапляў у катэгорыю выбіўшыхся з рытму жыцця, непаўнавартасных людзей (перастаркі) [10,65].

4. Эратычная кампанента перыяду "гульні" знаходзіць выяўленне на *вербальным і акцыянальным* узроўнях, і пры іх узаемкдзеянні.

4.1. Насычанасць маладзёвага фальклору эратычнай тэматыкай, праговорванне ўсіх іпастасяў тэмы міжполавых адносінаў на сімвалічным узроўні, у абавязкова дасціпнай, жартоўнай ды іранічнай форме стварала ў маладзёнаў уяўны (ці як прынята зараз - віртуальны) сексуальны вопыт, які разбураў поўную неабазнанасць, мажлівыя комплексы ў сферы рэальных полавых дачыненняў і арганічна ўводзіў іх ў цялесна- пачуццёвы свет "дарослага" жыцця.

Да прыкладу, адной з формаў "пранікнення" у "дарослую тэму" з'яўляліся двухсэнсоўныя загадкі, дзе адна з адгадак насіла падкрэслена эратычны характар, але "правільны" адказ з'яўляўся бяскрыўдным. Азначаючы асаблівую папулярнасць такіх загадак сярод моладзі, Ніл Гілевіч слушна заценіў, што яны "вельмі адпавядалі натуральней для пераходнага ўзросту ціікавасці да тэмы полавых адносінаў" [11,62]. Прывядзем некаторыя з іх: "А ў нашага татулькі залатыя батулькі, як забаўтаюцца, дык усе здагадаюцца" (звон); "Дзед вісіцца, баба шкліцца, сыйдуцца разам - цалуюцца" (калодзеж з журавом); "Каб не дзедава качалка, сохла б бабіка мачалка" (тое ж)[11,19]; "Па чатыры, па пяць, залупіўшыся вісяць" (лясныя арэхі) [12,330,335]; "Прыбег Хвілька, забіў шпільку: Ах, Хвілька, харошая твая шпілька! Прыбягай паскарэй, забівай пакрапчэй" (маслабойка); "Выскачылі юры з пад каменнай гары, сталі над бабай юрыць, аж хата дрыжыць"(таўкач і ступа) [13, 236,234].

*4.2. Акцыянальны ўзровень. Пры* дасягненні шлюбнага ўзросту істотным чынам мяняецца характар гульняў і забаў моладзі. Калі ў падлетковым узросце ў гульнях прыявелявала ідэя спаборніцтва, то маладзёвыя гульні маюць за асноўную задачу злучэнне пар, якое суправаждаецца даволі шчыльным фізічным кантактам паміж гульцамі (ловы, абдымкі, пацалункі), што выяўляецца ў такіх гульнях, як "Цяцерка", "Падушачка", "Рэдзька", "Яшчар", "Лунёк" ды інш, шырока распаўсюджаных на Паддзвінні. Вербальнае суправаджэнне гэтых гульняў толькі падкрэслівае іх "плоццевую" сутнасць: "Звалілася пані з печы", /Разбіла грудзі і плечы , / Радзіла сына Мартына,/ На колiч-

ку пасадзіла..." ("Рэдзька") [14 ,509], ці "Каго люблю, каго люблю , / Гаго пацалую,/ Пухавую падушачку/ Таму падарую" ("Падушачка") [14 ,101].

Яшчэ ў канцы XIX ст. на Віцебшчыне і Меншчыне ў маладзёвым асяродку быў распаўсюджаны звычай "падначовак", калі хлопец праводзіў ноч са сваёй абранніцай, ці то пасля вячорак у асобна адведзенай для "папрадак " хаце, ці то таемна прабіраўся ў хату да самой дзяўчыны [15, 290-291]. У летні перыяд "на ночкі" збіраліся на гумнах [16, 190], аднак абавязковым патрабаваннем да гэтых "падначовак" было захаванне дзяўчынай цнатлівасці". У зваротным выпадку пара жорстка асуджалася нават у межах маладзёвага калектыву і магла быць з яго прымусова выдаленая [17, 365].

Натуральна, што маладзёвая гульня" арганічна спалучала як акцыянальную ,так і вербальную кампаненту, набываючы найбольш рэльефныя формы падчас найбольш значных святаў гадавога цыклу (Каляды, Масленіца, Гуканне Вясны, Сёмуха, Купалле і інш.).

5. "Жаніцьба Цярэшкі". Сімвалічны пласт выяўлення эротыкі больш падрабязна праілюструем на прыкладзе "Жаніцьбы Цярэшкі" - унікальнага абрадавага ігрышча, бытаванне якога амаль выключна супадае з арэалам рассялення полацкіх крывічаў [18, 56]. Апісваючы гэтую гульню ў 1884 годзе ў в. Махірава Полацкага павета, М.Нікіфароўскі падкрэсліваў яе рытуальны характар: "Як больш выдатная, нібы свяшчэнная, гульня гэта выконваецца даволі рэдка і выключна зімой, у дні гадавых свят ,як напрыклад, Каляды, Новы год, і ў Загавенне перад Вялікім пастом..." [18, 64]. Абрадавы характар "Жаніцьбы" выкікае таксама і з абавязковасці яе правядзення, санкцыянаванага менавіта з боку дарослых: "Бацькі ніколі не ўмешваліся ў "Цярэшку", не забаранялі "Жаніць Цярэшку," наадзарот нават загадвалі гэта рабіць... (Докшыцкі р-н) [18,81]. Дагэтуль канчаткова не высветленым застаецца сам вобраз "Цярэшкі". Аднак аналіз фальклорнага матэрыялу (Цярэшка, Цялешка, Цяльгешык - у беларускіх казках - цраўляны хлопчык) і функцыяў Цярэшкі падчас "Жаніцьбы" дазваляе пагадзіцца з думкай Г.Барташэвіч аб фалічным характары гэтага персанажа [19,86]. Да таго ж слова "цярэх" у беларускай мове мае значэнне "таўкач" [20,688], які, у сваю чаргу, фальклорнай традыцыяй адназначна трактуецца як сімвалічны займеннік эрагаванага дзетароднага органа мужчыны [21,87-92].

У гэтай сувязі паказальна, што ў самым вядомым свяцілішчы Эрота, якое знаходзілася ў Феспіях, беатыйцы ўшаноўвалі яго ў выглядзе проста-

га фалічнага слупа, а Прыап, бог вытворчых сілаў зямлі ,"узнік з грубых драўляных фалічных выяў" [22,40,50]. Само дзяленне "Жаніцьбы", звучание пар, якім кіруюць абраныя з шэрагу жанатых "матка і бацька", у тэкставым плане санкцыянуецца выключна Цярэшкам, які з'яўляецца ў выглядзе механошы і прыносіць рэчы, неабходныя для заключэння шлюбу: "Цярэшка чаху, чаху, / Што ў цябе ў мяху, мяху?/ -Шпілечкі, іголачкі, / Залаты пярецёначкі, / Ёлачкі ды палачкі, / Дзецкія забавачкі" [18,110, №15].

Калючыя падоўжаныя прадметы гэтага "шлюбнага набору" сімвалігуюць мужчынскі пачатак рэчы з адтулінай (мех, пярсцёнак, абаранак) - жаночы. Полавы сімвалізм гэтых рэчаў яскрава выяўляецца як у саміх "Цярэшках," так і іншых фальклорных тэкстах. Прыкладам, у вясельнай тэматыцы парваны мех азначае адсутнасць цноты у нявесты: "Распарсўся мех - і на бацьку грэх" [22,146], а "голка" выступае ў якасці актыўнага фігуранта ў першую шлюбную ноч: "Швачка была наша Васька,/Вышыла ўкруг падала /Тупой іглой без ізушка/ І чырвоным шоўкам"[23,709]. Зайздроснае ўмельства ў абыходжанні са сваёй "голкай" дэманструе і "дзядулька" цярэшкавых прыпевак: "Дзед бабе кажух шыіць, /Бабіна душа ныіць,/ Дзед бабе кажух пашыў,/Сем раз на начы прасіў" [18,141. № 139].

Тэма страты дзяўчынай цнатлівасці і, адпаведна, пераходу з дзявоцкага ў жаночы стан сімвалічна абыгрываецца на працягу ўсёй "Жаніцьбы", выяўляючыся ў разнастайных сюжэтных вобразах. Найбольш тыповым з'яўляецца сюжэт з "патапленнем" бабулькі дзедам: "Дзед бабу тапіць вядзець, / А баба крычыць, няйдзець. /-Хай цябе кадук бярэць, /Як ты мне хвартук дзярэш!" [18,140№ 135]. "Як у касмалагічным, так і ў антрапалагічным планах пагружэнне ў воды азначае не канчатковае згасанне, а часовае вяртанне ў вобласць аморфнага, за якім ідзе сатварэнне новага жыцця ці "новага чалавека", у залежнасці ад таго, ці вядзенца размова пра касмічнае, біялагічнае ці сатэрыялагічнае" [3,83].

Разрыванне "дзядулькай" хвартука, які ў народнай традыцыі сімвалізаваў жаночыя геніталіі, а ягоная наяўнасць (захаванасць) у дзяўчыны - яе цнатлівасць [21, 129-130], відавочна ўказвае на сексуальны характар "патаплення" бабулькі. Паказальна, што сам дзеяслоў "купацца" ўзыходзіць да індаеўрапейскага караня *kup-ca* значэннем "кіпець, горача жадаць" [24, 29], а беларуская фальклорная традыцыя трактуе "намаканне" вянка як страту дзяўчынаю цноты" [25, 221. № 187].

Дашлюбныя (пазашлюбныя) полавыя зносіны, не санкцыянаваныя вя-

сельным рытуалам, атаясамліваліся з выхадам, "выпадзеннем" са сферы культуры і ўваходжаннем чалавека ў зону Прыроды, дзе ўчынкі і дзеянні нерэгламентаваныя ніякімі нормамі: "Пападдзя пшанічку жала, / У полі заначавала./ У полі пад ёлкаю / З маладым Міколкаю" [18,143.№146]. Паколькі, на думку М.Нікольскага, "яшчэ ў старажытнасці ў продкаў беларусаў елка з яе характэрнымі шышкамі лічылася фалічным дрэвам" [26, 218], то начоўка дзяўчыны ў лесе "пад елкаю" мела ў народнай традыцыі адназначную дэшыфроўку. Так, на Лепельшчыне радзіна маладога кпіла з нецнатлівай нявесты наступным чынам: "Пад ёлкай расла, /Не дзеўкай прыйшла / Пад ёлкаю спала /Не дзеўкаю ўстала. / З ёлкі звалілась, / На сук прабілась" [23, 204-205].

Падобнае прачытанне маюць і "Цярэшкі" пра выправу дзяўчыны ў лес па арэшкі, яе згоду / нязгоду паіць хлапецкага каня са свайго вядра да інш., падрабязна ахарактарызаваць якія ў межах дадзенага матэрыялу не ўяўляецца магчымым. Апроч тэкставай кампаненты, у "Жаніцьбе Цярэшкі" сам характар дзеянняў моладзі ("скручванне" пар ў танцы, "ловы" бабулькі дзядулькай і наадварот) меў выразную шлюбную афарбоўку, бо "на мове гульні танец-скокі сімвалізуе "шлюб" [27,315], але адначасова "скруціцца" ў дачыненні да дзяўчыны азначае страчаную ёю цноту. Падчас усёй гульні моладзь выяўляла на індывідуальным узроўні свой спрыт, зухаватасць, увішнасць у абыходжанні з партнёрам, пачуццё гумару і тонкасць у смяховінах адначасова. Усё гэта,- як пісаў А.Багдановіч,- перасыпаецца досьціпамі, жартамі, прымаўкамі на адрас "сваццproperties", так і на адрас "маладых", калі ёсць да таго зачэпка, асабіва, калі хлопец нязграбны і не здолее ўтрымаць дзяўчыну" [18, 73]. Папулярнасць жа "Цярэшкі" сярод моладзі даследчык тлумачыў тым, што "тут нязмушана выяўляюцца іх густы і ўзаемныя сімпатыі" [18, 72]. І далека невыпадкова, што сімвалічныя шлюбныя пары, што ствараліся падчас "Цярэшкі", нярэдка рабіліся рэальнымі сямейнымі парамі.

Сімвалічны характар "Жаніцьбы", негледзячы на "праграму-максімум", што ставілася перад "маладымі" ("Мая ж ты жанулечка, / Я ж твой мужулечка! / Мы ж будзем на свеце жыць, /Мы ж будзем дзяцей пладзіць. /Мы ж будзем гарэлку піць, / Мы ж будзем дзяцей жаніць" [18,73], не вымагаў неадкладнай яе рэалізацыі: "Не топай, дзядулька, нагой, /Не лягу я спаць з табой, /Бо я ні вянчоная / -На вечар злучоная" [18,178,№300[. Прычым "спаць" у гэтым сэнсе азначала "выконваць шлюбны абавязак" і не выключала сумесных начовак моладзі пасля завяршэння "Жаніцьбы":

"Хлопцы і дзеўкі...пад канец вечара, далёка за поўнач, па папярэдняй згодзе кладуцца спаць парачкамі" [18, 69].

Такім чынам, нават папярэдні і далека не поўны дослед у галіне традыцыйнай эротыкі беларусаў (па-за рамкамі засталася "дарослая" эротыка, выяўленая, перадусім, у Вясельнай і Радзіннай абрадавасці), дазваляе разбурыць стэрэатып пра "неразвітасць" полавых пачуццяў у вяскоўцаў, што склаўся яшчэ ў XIX ст., і убачыць жыццёвы свет нашых продкаў гранічна поўным і дасканалым, не толькі ў вымярэнні чалавечага быцця, але і ў касмічнай перспектыве.

## ЛІТАРАТУРА


1. Кон И.С. Введение в сексологию. М., 1989
2. Топорков А.П. Малоизвестные источники по славянской этносексологии (к.XIX-н.XXв.)// Этнические стереотипы мужского и женского поведения. СПб.,1991.С.301-318.
3. Элиадэ Мирча. Священное и мирское. М.,1994
4. Шлюбскі А. Матэрыялы да вывучэння фольклёру і мовы Віцебшчыны. Ч.II. Менск,1928.
5. Байбурин А.К. Обрядовые формы половой идентификации детей // Этнические стереотипы мужского и женского поведения. СП6.1991.С.257-265
6. Werenko F. Drzyczyntk do Lecznictwa lubowego // Materialy antropologiczo-archeologiczne i etnograficzne. T.l /Krakow 1896,S.99-228.
7. Романов Е.Р. Белорусский сборник. Вып.8. Вильно,1912.
8. Никифоровский Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... в Витебской Белоруссии. Витебск. 1897.
9. Бернштам Т.ВА. Совершеннолетие девушки в метафорах игрового фольклора (традиционный аспект русской культуры) //Этнические стереотипы мужского и женского поведения. СПб, 1991.С.234-257.
10. Байбурин А.К. Ритуал в традиционной культуре. СПб, 1993.
11. Гілевіч Н. Паэтыка беларускіх загадак. Мн., 1976.
12. Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі. Мн.,1983.
13. Загадкі. Мн., 1972.
14. Гульні, забавы, ігрышчы. Мн.,1976.

15. Довнар-Запольский М.В. Заметки по белорусской этнографии // Живая старина 1893. Вып.2. С.283-296.

16. Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения С.-Зап.края. Ч.III. СПб, 1903

17. Зеленин Д.К. Восточно-славянская этнография. М.,1991.

18. Жаніцьба Цярэшкі. Мн.,1993.

19. Барташэвіч Г.А. Матывы шлюбу ў зімовай абраднасці і паэзіі //Весці АН БССР. Сер. Грамад. Навук. 1988, №4.

20. Насовіч І.І. Слоўнік беларускай мовы. Мн., 1983.

21. Валодзіна Т.В. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. Мн.,1999.

22. Грейвс Р. Мифы Древней Греции. М.,1992.

23. Вяселле: Песні. Кн.6. Мн., 1988.

24. Иванов В.В., Топорков В.Н. Купала //Мифы народов мира. Энциклопедия. Т.2. М.,1992.

25. Паэзія беларускага земляробчага календара. Мн.,1992.

26. Никольский Н.М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. Мн.,1956.

27. Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн.3. Мн., 1999.

# ТВЛ ЯК НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ Ў ЛІТАРАТУРЫ
## Тэзісы да навуковага даклада

*Ж.П.Мацвіенка (Наваполацк)*

ТВЛ - Таварыства Вольных Літаратараў - гэта назва літаратурнага аб'яднання, якое арганізацыйна аформілася ў 1993 годзе / 8 мая ТВЛ правяло свой устаноўчы сход / .

Слова "генерацыя" тлумачальны слоўнік вызначае як групу арганізмаў у папуляцыі, аднолькава аддаленых у роднасных адносінах ад агульных продкаў, або ў другім значэнні - пакаленне. Такім чынам, прадстаўнікі ТВЛ лічаць сябе новым пакаленнем у літаратуры. Сваім узнікненнем і існаваннем ТВЛ абавязана перш за ўсе такой творчай асобе як Алесь Аркуш / Аляксандр Барысавіч Козік / . Яго называюць заснавальнікам і ідэолагам ТВЛ / Аб гэтым піша Кісліцына Г. у "Культуры" № 35 за 1996 г. / У той час А. Аркуш жыў у Наваполацку і іменна наш горад стаў цэнтрам аб'яднання маладых літаратараў у новае таварыства. З той пары фонды нашага музея і папаўняюцца ўвесь час новымі выданнямі ТВЛ.

Чаму ж узнікла Таварыства? Што ставілі мэтай літаратары, ствараючы яго?

Першая і галоўная мэта - гэта адбудаваць, стварыць новую сістэму літаратурнага гаспадарання. А для чаго - на гэта ўказвае А. Аркуш у сваім артыкуле "Тры гады на волі" /"Культура", № 18, 1996 г./ На яго

думку, раней любая літаратурная ініцыятыва лічылася шкоднай, бо магла прывесці да непажаданага перадзелу ў літгаспадарцы. Усе было абмежаваным - колькасць літаратурных пасад, прэмій, званняў, немагчыма было прапанаваць уласныя праекты. Значыць, трэба было мяняць такое становішча.

Другая мэта, дзеля якой аб'ядналіся пісьменнікі ў ТВЛ, пераканаць усіх, што беларуская літаратура паўнавартасная і развіваецца па агульных для Еўропы законах і эстэтычных правілах.

І яшча адна агульная мэта нарадзіла ТВЛ. На зломе двух стагоддзяў ва ўсім свеце назіраецца эстэтычны, культуралагічны крызіс. Якой будзе літаратура XXI стагодзя - невядома. Усе новае павінна прайсці доўгі шлях. І магчыма, што некамерцыйнае наватарскае мастацтва ТВЛ запоўніць гэту нішу ў літаратуры. Значыць, магчымасць стаць стваральнікамі новай літаратуры XXI стагоддзя прывабіла прыхільнікаў новай плыні.

Вось чаму ТВЛ-аўцы і сення ўхваляюць любыя эксперыменты ў беларускай лігаратуры, а лепшыя набыткі іх папулярызуюць за межамі краіны. На думку саміх прадстаунікоў ТВЛ, яны ўзялі на ўзбраенне канцэпцыі еўрапейскага постмадэрну, якія агучваюць і ўводзяцца ў нацыянальны кантэкст.

Ці быў калі на Беларусі мадэрнізм? 1 наогул, што гэта такое? У пераьладзе з французкай мовы гэта слова азначае "найноўшы", "сучасны". Мадэрнізм, як і жывапіс віцебскай школы, распачынаецца ў беларускай літаратуры неўзабаве пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года і мае відавочна "левы" накірунак, пра што сведчыць твсрчасць літаратурнага аб'яднання "Маладняк", праграма "Узвышша" і г.д.

Як ішло развіцце мадэрнізму ў літаратуры? Спярша з ім змагаліся, вышуквалі, каб асудзіць, лічылі чужародным для грамадства, потым была фаза замоўчвання /няма мадэрнізму - няма праблем/ і, нарэшце, цяпер настаў час, калі літаратурныя накірункі зноў, як і у другой палове XIX стагодзя, паўсталі ў выглядзе веера.

Постмадэрн на Беларусі вынікае з крызісу беларускай савецкай літаратуры, ці, па словах ТВЛ-аўцаў, бээсэсэршчыны.

Беларускія постмадэрністы прайшлі добрую школу еўрапейскага і расійскага мадэрнізму. Гэта якраз ілюстрацыя таго, што мастацтва не мае межаў.

Нараджэнне беларускага постмадэрнізму есць вынік сенняшняй культуралагічнай сітуацыі ў краіне. Гэтаму працэсу нараджэння спрыялі ў асноўным дзве падзеі:

1) ліквідацыя цэнзуры

2) з'яўленне незалежных плюралістычных літвыданняў

Словазлучэнне "беларускі постмадэрнізм" стала з'яўляцца ў працах

літаратуразнаўцаў і крытыкаў прыкладна у 1994 годзе / газета "Наша ніва" № 3, 1994 г. / А ўжо ў 1995 г. у беларускіх выданнях было надрукавана шэраг тэкстаў, цалкам прысвечаных тутэйшаму літаратурнаму постмадэрну.

Таварыства Вольных Літаратараў - гэта аб'яднанне рэспубліканскага маштабу. Даволі значныя суполкі яго існуюць у Гродне, Мінску. Але тут у нас, на полацкай зямлі, цэнтр, я б сказала сэрца ТВЛ. У Наваполацку жыў, а зараз жыве ў Полацку Алесь Аркуш, сябрамі ТВЛ з'яўляюцца наш празаік Вінцесь Мудроў, паэт Сяржук Красоўскі, крытык і перакладчык Алена Ніякоўская, літаратары і гісторыкі Сяржук Шыдлоўскі; Уладзімір Лобач, нашы землякі-палачане Лера Сом, Пятро Васючэнка / раней жыў у Полацку / . У рэдакцыйную калегію часопіса "Калоссе" уваходзіць і Уладзімір Арлоў, вядомы празаік, жыццевы і творчы лес якога доўгі час быў звязаны з нашым горадам.

На сенняшні дзень аб'яднанне актыўна працуе. ТВЛ-аўцы выдалі бібліятэчку твораў 12 аўтараў пад агульнай назвай "Паэзія новай генерацыі", альманах "Ксэракс беларускі", часопіс "Калоссе", зацвердзілі сваю незалежную прэмію, так званы Гліняны Вялее, удзельнічаюць у міжнародных канферэнцыях і друкуюць свае творы ў Расіі, Украіне, Польшчы і іншых краінах.

Каб мець уяўленне аб іх творчасці, дастаткова пачытаць іх часопісы. Для ТВЛ-аўцаў страчваецца важнасць саміх твораў, на першы план выходзіць чын творчасці, які ахоплівае ўсе, што звязана з творцам. І можа таму не заўсёды трэба шукаць сэнс у гэтых творах, а ў першую чаргу суперажываць пачуццям творца.

Літаратары гэтай плыні маніякальна баяцца хлусні і канфармізму. Яны - анархісты па сваіх падспудных перакананнях і хочуць заўсёды заставацца самімі сабой. Для іх галоўнае - свабода, аб чым пішуць і ў сваіх творах:

"Парадак усталюе тут
Бадай што толькі мужнасць духу.
Змагайся з д'яблам, космас слухай,
Вазьмі СВАБОДУ за статут." / А. Аркуш /

Безумоўна, пазнаеміўшыся з творчасцю членаў ТВЛ, з іх поглядамі, тэарэтычнымі абгрунтаваннямі ўзнікае вельмі шмат пытанняў. Можна многа разважаць, нават спрачацца. Але ўсе ж калі такая плынь змагла выразна заявіць аб сабе, значыць, яна варта ўвагі, варта даследавання, яна мае права на існаванне і знаходзіць прыхільнікаў.

# ДОКУМЕНТЫ ЗОНАЛЬНОГО ГОСАРХИВА В Г. ПОЛОЦКЕ - ОДИН ИЗ ИСТОЧНИКОВ ИЗУЧЕНИЯ ИСТОРИИ РОДНОГО КРАЯ

*И.Д.Третьяк (Полоцк)*

Интерес всякого цивилизованного общества к своему прошлому - непременный закон развития. Следует отметить, что в последнее десятилетие интерес нашего общества к прошлому белорусского народа, истории Беларуси значительно возрос. Главным источником такой ретроспективной информации являются архивы.

Архивы, как люди, имеют свои судьбы: счастливые и не очень. Они рождаются, живут и разделяют все те невзгоды, которые выпадают на долю государства, на территории которого они находятся. Трагическая история нашего государства известна каждому.

**Сегодня мне бы хотелось остановиться на истории создания архива в г. Полоцке и кратко охарактеризовать хранящиеся в нем документы, которые являются бесценным источником изучения Полотчины.**

Полоцкий уезд вошел в состав БССР в марте 1924 г. К тому времени в г. Полоцке накопилось много архивных материалов. В июле 1924 г. архивы г. Полоцка обследовал научный сотрудник Витебского архивного бюро Болеслав Брежго. В докладной записке в бюро он упоминает архивы Полоцкого уездного исполнительного комитета, отделов социального обеспечения и народного образования, уездного земельного управления, продовольственного комитета; казначейства, среди которых были ревизские сказки. В 1-ой советской школе, угол улиц Троцкого и Вознесенской, находились архивы 1-го Полоцкого городского училища за 1900-1912гг., 1-го Высшего начального училища за 1912-1918гг., Дриссенской дворянской опеки, Комиссии по охране памятников старины и искусства. Во 2-ой советской школе, ул. Ленина, 29, хранились архивы Полоцкого училища В. Ф. Рульковиус, начиная с 60-х годов XIX в. по 1903 г.; казенной женской гимназии за 1903-1919гг. В педагогическом техникуме были архивы учительской семинарии с 1872 г., педагогических курсов и техникума до 1924 г.

**В Богоявленском монастыре Б. Брежго нашел остатки архива этого монастыря с 1711 г. В то время была еще старая опись всего архива бывшего монастыря. В Николаевском соборе также сохранились остатки архива.**

Осмотрев архивы г. Полоцка, Б. Брежго пришел к выводу, что в городе должен быть организован окружной архив, куда, по мнению автора, "...следует сосредоточить, как разбросанные по городу, так и находящиеся в Дриссе и других пунктах Полоцкого округа старые архивы и законченные дела учреждений революционного периода..."

**Центральный архив Белоруссии письмом от 24 сентября 1924 г. сообщал, что архив в городе Полоцке будет окружным отделом Центрального архива БССР и будет находиться в непосредственном его ведении.**

**С этого времени начинается переписка между Полоцким окружным исполнительным комитетом и Центральным архивом БССР об организации в Полоцке окружного отдела.**

24 декабря 1924 г. Полоцким окрисполкомом был назначен заведующим отделом Центрархива БССР Иосиф Фридман.

Архив был в хаотическом состоянии. Почти 90% дел не были даже подшиты, а только сложены в папках; много дел находилось в мешках, так как до этого времени архив располагался на чердаке окрисполкома, где не было возможности работать.

На 1 января 1925 г. в отделе насчитывалось 4564 единицы хранения и 655 книг.

3 января 1925 г. Полоцкий окружной отдел сообщал Центрархиву БССР, что отделу выделено помещение по Генеральному переулку, 7, на первом этаже. Началась работа по выявлению вопроса уничтожения архивов Полотчины во время эвакуации, революции, оккупации и гражданской войны. Был поднят вопрос о возвращении в г. Полоцк эвакуированных в годы империалистической войны архивов.

2 февраля 1925 г. заведующим окружным отделом был назначен Яков Тарасович Данон, который в рапорте на имя заведующего Центрархива БССР указывал на то, что помещение под архив еще не оборудовано, а поэтому не начато анкетирование архивов окружных учреждений; не было описей и указателей на собранные архивные документы.

14 февраля 1925 г. Я. Т. Данон пишет статью в газету "Полоцкий пахарь", в которой сообщает: "...в Полоцке открыт окружной отдел Центрархива БССР, который предлагает всем, кто уважает науку, помочь в

сборе и охране всего ценного для нашей науки. Каждый лист бумаги, тетрадь с какими-нибудь записями, бумаги официальные и личные,- все может иметь большую ценность. Полоцкая общественность должна откликнуться на этот призыв. Если кто знает что-нибудь об уничтоженных, гибнущих и хранящихся в архивах, должен сообщить в архивный отдел..."

В течение 1925 г. окружной отдел ведет переписку с Ульяновским губернским архивным бюро и архивом о возвращении музея и архива бывшего Полоцкого кадетского корпуса в количестве 235 дел; с Владимирским губернским архивным бюро о возвращении архива Полоцкого мужского духовного училища в количестве 458 дел за 1899-1918 гг.; с общим отделом Ростовского уездного исполнительного комитета Ярославской губернии, о возвращении наряда церковных документов Спас-Юровичской епархии за 1841 г.; с Ростовским уездным отделом народного образования о возвращении архива Полоцкого Спасо-Ефросиньевского монастыря.

В 1925 г. Полоцким отделом Центрархива БССР ведется также переписка с Белорусским государственным музеем в г.Минске о передаче креста Ефросиний Полоцкой в музей. Я.Т.Дадон в письме от 3 июня 1925 г. сообщает, что крест Ефросиний 12 века находится в древней церкви Спасского монастыря под охраной общины. Актом от 2 июня 1925 г. крест взят на учет как памятник Белорусского древнего искусстЕа. Институт Белорусской культуры возлагал ответственность за охрану креста на Полоцкий окружной исполнительный комитет. В случае ликвидации церковной общины крест должен был быть передан государственному музею.

В 1926 г. окружной отдел Центрархива БССР был преобразован в Полоцкий окружной архив. За этот год было выявлено 227 архивов, из которых 59 по техническим причинам не были учтены; это архивы дореволюционного периода, в основном церковные и бывших государственных учреждений.

В архивных документах имеются сведения, что Полоцкому окружному краеведческому музею в 1927 г. архивом были переданы книга рукописной нотописи Богоявленского монастыря 17 века и книга, написанная в 1656 году в честь благословения архимандрита Полоцкого Борисоглебского монастыря Игнатия Иевлевича.

В связи с ликвидацией в 1930 г. окружного административно-территориального деления в Белоруссии Полоцкий окружной архив ликвидирован, а его фонды переданы в архивохранилище в г.Витебске.

В соответствии с Постановлением ЦИК БССР от 5 декабря 1935 и 5 февраля 1936г. в г.Полоцке в январе 1937г. был образован районный государственный архив, который находился по ул.Надвинской-К.Маркса 19/21 в здании райисполкома. В 1941 г., во время налёта немецкой авиации на Полоцк, здание сгорело вместе с хранившимися в нём документами. К началу войны в архиве хранились документы за 1919-1938 гг. с общим количеством 15150 единиц хранения.

В декабре 1944 г. в г.Полоцке, как центре области, были созданы Архивный отдел, а в январе 1945 г. областной государственный архив. Помещения для архивохранилища не было. Архивный отдел и облгосархив располагались в одной комнате в здании УНКВД Полоцкой области.

Комплектование облгосархива документами начали со сбора россыпи, находившейся в районных и сельских местностях. К концу 1945 г. сотрудники сконцентрировали в архиве 3 тонны листовой россыпи, из которой впоследствии были сформированы 38 архивных фондов. Вместе с листовой россыпью поступало много печатной литературы, издававшейся на временно оккупированной территории. В 1948 г. из Витебского облгосархива поступило 300 фондов, включавших 49000 единиц хранения. Документы поступали также из ЦГА Литовской ССР, ЦГА БССР, Госархива Минской области, Госархива Горьковской области и других архивов.

В мае 1948 г. решением Полоцкого облисполкома архиву для восстановления было передано здание Софийского собора. В то время считалось, что это здание вполне пригодно для размещения госархива области. В ноябре архитектурное Управление при СМ БССР на ремонт и восстановление Софийского собора, как памятника старины, выделило архиву 30 тысяч рублей и наряды на строительные материалы в количестве: 3 тонны кровельного железа, 100 квадратных метров стекла, 200 килограммов гвоздей и 60 кубометров леса. В феврале 1949 г. госархив переехал в здание Софийского собора и расположился в алтарной части.

На 1 апреля 1949 г. на хранении в архиве находились 418 фондов /53108 единиц хранения/, из которых обработано было 72 фонда /15140 единиц хранения/.

К концу 1951 г. завершилось упорядочение документальных материалов. Всего было приведено в порядок 425 фондов, насчитывавших 67700 единиц хранения.

С ликвидацией в марте 1954 г. Полоцкой области в г.Полоцке были ликвидированы областные архивные учреждения и организован Полоцкий городской архив.

1 января 1964 г. в соответствии с Постановлением СМ БССР от 11 ноября 1963 г., № 537 упразднены Полоцкий городской и районный архивы, Верхнедвинский, Лепельский, Россонский и Ушачский районные государственные архивы, а на их основе образован филиал госархина Витебской области в г.Полоцке, который Указом Президента Республики Беларусь "Об утверждении Положения о Национальном архивном фонде РБ, а также сети государственных архивных учреждений РБ" от 20 сентября 1996 г., № 373 преобразован в зональный госархив в г.Полоцке.

На 1 января 2001 г. в зональном госархиве находились на хранении 2019 фондов, которые насчитывают 327422 единицы хранения.

Архив хранит документы учреждений и организаций Полоцкого уезда и округа, Полоцкой области, Верхнедвинского / до 25 декабря 1962 г. Дриссенского/, Лепельского, Полоцкого, Россонского, Ушачского и ликвидированных Ветринского и Освейского районов; городов Лепеля, Новополоцка, Полоцка за 1918-1941, 1943-1999гг., которые освещают вопросы установления советской власти, восстановления и развития народного хозяйства после гражданской и Великой Отечественной войн, развитие науки, культуры, образования, здравоохранение, физкультуры, спорта и другие.

В фондах органов государственной власти и государственного управления имеются декреты, постановления, решения, распоряжения вышестоящих органов, документы о деятельности местных Советов и их исполнительных комитетов, об охране природы, а также документы по расследованию и установлению злодеяний, совершенных фашистами во время Великой Отечественной войны, и учёту причиненного ущерба; списки репатриированных граждан по Дриссенскому, Лепельскому, Освейскому и Россонскому районам, г.Полоцку.

В фондах учреждений, организаций и предприятий народного и сельского хозяйства, планирования, статистики имеются документы о работе промышленных предприятий, транспорта, связи; статистическая отчётность по всем отраслям народного хозяйства.

В фондах учреждений образования, науки, культуры, здравоохранения, физкультуры и спорта имеются сведения о развитии культуры, образования, ликвидации неграмотности, состоянии и развитии здравоохранения, социального обеспечения, физкультуры и спорта.

Фонды органов суда, прокуратуры, нотариата содержат документы об организации работы органов юстиции, о надзоре за судебной деятельностью, исполнением законов, привлечением к ответственности лиц, совершивших правонарушения.

Фонды Бигосовской и Фариновской таможен содержат Постановления Совета Народных комиссаров РСФСР, циркуляры, приказы, распоряжения таможенных учреждений; протоколы технических совещаний работников таможенных учреждений, а также дела по задержанию лиц с контрабандными товарами.

Фонд Уполномоченного Совета по делам русской православной церкви при Совете Министров СССР по Полоцкой области содержит сведения о количестве православных церквей, молитвенных домов, о православном духовенстве.

Значительную группу составляют документы по личному составу учреждений, организаций и предприятий. По этим документам зональный госархив в г.Полоцке выдает архивные справки социально-правового характера.

Зональный госархив обслуживает также пользователей Республики Беларусь и других государств, изучающих архивные документы для использования в научной, учебной, народнохозяйственной, социально-политической и культурно-просветительной целях. В области доступа к архивным документам национальное архивное законодательство базируется на основополагающих принципах общедоступности, публичности и бесплатности открытой архивной информации и гарантирует ее предоставление всем пользователем. Среди важнейших принципов, закрепленных в архивном законодательстве, также и свобода распоряжения пользователем выявленными им в архиве сведениями, кроме случаев, когда он намерен использовать их в коммерческих целях.

Завершить свое выступление хочу словами одного из сотрудников Полоцкой уездной комиссии по охране памятников старины и искусства, которые были сказаны еще в 1920 г., но не потеряли свою актуальность и через 80 лет, в начале третьего тысячелетия: "Будем же охранять по мере своих сил, те памятники старины и искусства, которые еще остались в нашем Полоцке и его уезде неразрушенными и неуничтоженными!", заменив слово "уезд" на современное слово - регион.

# І.П.ДЭЙНІС - ДАСЛЕДЧЫК ПОЛАЦКАЙ ГІСТОРЫІ

*І.А.Шупенька (Полацк)*

Мы жывем на зямлі, па якой знакамітыя людзі прайшлі.

Мы жывем на прапахлай легендамі, цудоўнай і велічнай Полацкай зямлі. Гэтая зямля нарадзіла і ўзгадавала шмат знакамітых людзей, якія праславілі сваю бацькаўшчыну не толькі ў сябе на радзіме, але і далека за яе межамі. І мы можам па праву ганарыцца тым, што маем магчымасць хадзіць гэтымі сцежкамі і берагамі, дакранацца да сівой даўніны, пранікнуць у думкі і памкненні нашых прашчураў.

Полацк - горад з багацейшай гістарычнай спадчынай.

І ў горада з такой цікавай гісторыяй шмат не толькі тых асоб, якія гэтую гісторыю стваралі, але і яе даследчыкаў і збіральнікаў.

І тут свае пачэснае месца займае старэйшы выкладчык, краязнаўца /«краевед-любитель», як ен сам сябе называў/, Ганаровы грамадзянін горада Полацка Дэйніс Іван Пятровіч. Равеснік стагоддзя, ён быў сведкам і ўдзельнікам многіх падзей свайго часу, якія і адлюстраваў у сваіх працах, замалеўках і даследваннях.

Цяга да вывучэння і даследвання гісторыі свайго краю была ў нейкай ступені закладзена генетычна. Бацька Івана Пятровіча - Петр Іосіфавіч Дэйніс, быў настаўнікам. Але выкладаючы такі прадмет, як фізіка, ен шмат

часу ўдзяляў вывучэнню гісторыі таго краю, дзе жыў. У Полацк прыехаў у 1905 годзе і стаў працаваць настаўнікам-інспектарам Полацкага гарадскога 4-х класнага вучылішча. Працуючы ў Полацку, закончыў Маскоўскі археалагічны інстытут і атрымаў званне вучонага археолага. Удзельнічаў у розных краязнаўчых мерапрыемствах, пры раскопках, прысутнічаў пры ўскрыцці мошчаў Еўфрасінні Полацкай.

У 1920-1924 гадах узначальваў уездную камісію па ахове помнікаў даўніны і мастацтва. Напісаў дысертацыю на тэму «Полоцкие церковные древности в их историческом прошлом и настоящем». І зразумела, што і свайму сыну ён перадаў некаторыя дакументы і матэрыялы, асабістыя рэчы. І самае галоўнае - цягу да вывучэння і даследвання гісторыі Полаччыны.

Іван Пятровіч Дэйніс нарадзіўся ў 1900 годе ў горадзе Невелі. У 1905 годзе з бацькамі пераязджае ў Полацк. І з гэтага часу жыў у Полацку. Вучыўся у Віцебскай мужчынскай гімназіі. У 1919 годе вучыўся на педкурсах. Затым працаваў настаўнікам. У 1921 годзе працаваў выкладчыкам на 43-х аб'яднаных курсах РСЧА, начальнікам якіх быў Я.Ф.Фабрыцыус З 1925 г. старшыня Полацкага краязнаўчага таварыства. У 1925-1929 гадах вучыўся у Беларускім дзяржаўным універсітэце. З 1930 года пачаў працаваць выкладчыкам хіміі, фізікі, глебазнаўства ў Полацкім лясным тэхнікуме.

У гады Вялікай Айчыннай вайны быў дырэктарам Белаярскага дзіцячага дома на Урале, настаўнікам ў сярэдняй школе. Пасля вызвалення горада Полацка ў 1944 годзе вярнуўся на працу ў Полацкі лясны тэхнікум. дзе і працаваў да выхаду на пенсію ў 1960 годзе.

У 1967 годзе Дэйнісу І.П. прысвоена званне Ганаровага грамадзяніна горада Полацка.

І увесь гэты час ён займаўся вывучэннем гісторыі Полаччыны, збіраў матэрыялы, перапрацоўваў іх. Удзельчаў у розных краязнаўчых мерапрыемствах, якія праводзіліся ў горадзе. Усё гэта ён з пранікнёнасцю і дасціпнасцю адлюстраваў у сваіх даследваннях, працах і замалёўках. Іван Пятровіч не толькі перапрацоўваў увесь накоплены матэрыял, але і рабіў нейкія свае высновы і заключэнні. Ен шчодра дзяліўся сваім вопытам, ведамі з тымі людзьмі, якія звярталіся да яго за нейкай парадай альбо кансультацыяй. Шмат сустракаўся са студэнцкай і школьнай моладдзю. Не заставаўся ў баку ад розных іншых агульнагарадскіх мерапрыемстваў.

Іван Пятровіч Дэйніс пакінуў пасля сябе вялікую спадчыну сваёй даследчай працы, значную частку якой ён перадаў нашаму музею-запавед-

ніку. У фондах Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка захоўваецца звыш 200 прадметаў сямейнага архіва Дэйнісаў, у які акрамя дакументаў і матэрыялаў Івана Пятровіча ўвайшлі і матэрыялы яго жонкі Любові Георгіеўны, а таксама двух яе сясцер: Алены Георгіеўны Александровіч і Веры Георгіеўны Казьянінай. Усе яны працавалі на ніве народнай адукацыі ў розных школах горада. І зразумела, што ўсе гэтыя матэрыялы цікавыя для знаёмства і даследвання.

Фарміраванне гэтага архіва было пачата яшчэ самім Іванам Пятровічам яшчэ пры жыцці. Асноўная ж частка прадметаў была атрымана ад сваякоў, ужо пасля смерці гэтага даследчыка.

Храналагічныя рамкі матэрыялаў архіва ахопліваюць час ад канца XVI да 80-х гадоў XX стагоддзя. Зараз мы рыхтуем каталог гэтага архіва, які сістыматызуе ўсе дакументы і матэрыялы. У архіў уваходзяць прадметы і матэрыялы краязнаўчага характару, сабраныя або распрацаваныя Дэйнісам І.П., асабістыя дакументы і рэчы, фотаздымкі і замалеукі.

Тут ёсць арыгінальныя, нават унікальныя матэрыялы.

Да гэтай групы можна аднесці мініяцюрны буклет «Полацк», які змяшчае 10 фотаздымкаў розных месц горада Полацка пачатку XX стагоддзя /аўтар-фотамастак Бермант/. Ён экспануецца зараз у МБК.

Змястоўнасцю вызначаюцца 5 альбомаў, якія ўключаюць замалёўкі, схемы і планы Полацка розных гадоў. Некаторыя з іх зроблены са спасылкай на нейкія крыніцы, іншыя ж зроблены аўтарам па памяці.

Цікавы альбом «Места, где мы жили», які змяшчае малюнкі Івана Пятровіча.

Вялікую цікавасць уяўляе рукапіс Дэйніса «Полацкая старына» у дзвух частках, дзе аўтар на аснове асабістага вопыту і акамуліравання вывучанага матэрыялу, са спасылкай на розныя крыніцы раскрывае гісторыю Полацка, яго помнікаў, вуліц, людзей і падзей. Гэты рукапіс зараз рыхтуецца да друку і ён будзе даступны для знаёмства больш шырокай аўдыторыі.

Некаторыя асабістыя дакументы гэтага архіва экспануюцца і ў іншых музеях. Так ў ПКМ знаходзяцца дакументы Івана Пятровіча 20-х гадоў, матэрыялы Александровіч А.Г. і Дэйніс Л.Г.

Акрамя таго, Дэйніс І.П. частку сваіх матэрыялаў перадаў у бібліятэку Полацкага ляснога тэхнікума. Гэта былі ў асноўным кнігі і часопісы з яго асабістай бібліятэкі.

Некаторыя яго успаміны знаходзяцца ў Полацкай гарадской бібліятэцы імя Ф.Скарыны. Частка асабістых дакументаў сям'і, некаторыя ўспаміны і рукапісы захоўваюцца ў Полацкім занальным архіве.

І яшчэ адну частку сваей спадчыны ён перадаў у іншыя музеі. Так у 1981 годзе Іван Пятровіч перадаў у Маскву, у дом-музей Васняцова, дыплом свайго бацькі аб заканчэнні археалагічнага інстытута 1915 года, які быў зроблены па эскізах Васняцова.

У Мінск, у Дзяржаўны музей, былі перададзены дакументы і матэрыялы, якія ў асноўным датычаць перыяду вучобы Івана Пятровіча ў БДУ.

Такім чынам, справа, распачатая Іванам Пятровічам Дэйнісам не згубілася ў мінулым, праца яго рук не схавалася пад напластаваннем пылу, а мае свой працяг і застанецца як прыклад служэння сваей справе і свайму гораду.

# ЗМЕСТ

*Боравская В.В.* Род Лубны-Герцык в контексте истории полоцких князей. Генеалогическая гипотеза....................................................3
*Боравская Е.Б, Боравский Б.В.* Краткие очерки о довоенной полоцкой медицине..........................................................................................8
*Быхавец І.А.* Сляды выдатных людзей на захадзе нашай вобласці...................................................................................................14
*Вазьміцель А.В.* Друкарская справа ў Полацку ў другой палове XIX-XX стст..........................................................................................17
*Галубовіч В.Ул.* Справа аб пацверджанні шляхецтва Яну Дзягілевічу, пісару месцкаму полацкаму................................................22
*Джумантаева Т.А.* Да пытання аб стварэнні краязнаўчага музея ў Полацку..............................................................................................29
*Дук Д.У.* Культурный сувязі палачан (па выніках вывучэння пячной кафлі XIV-XVII стст.)...........................................................33
*Жиркевич-Подлесских Н.Г.* Витебский губернатор Иван Степанович Жиркевич и его мемуары.................................................38
*Карасёў В.Р.* Людзі і падзеі ветрынскай зямлі: пошукі і знаходкі.....................................................................................................48
*Касцюкевіч С.У.* Краязнаўчая дзейнасць як адзін з напрамкаў працы дамоў рамёстваў Віцебшчыны................................................52
*Краско В.Д.* Краязнаўчы рух на Полаччыне ў 20-я гг.XXст.............56
*Лобач Ул.А.* Традыцыйная эротыка ў маладзёвай субкультуры беларусаў Паддзвіння (па фальклорных і этнаграфічных матэрыялах XIX-XX стст.).........................................................................................60
*Мацвіенка Ж.П.* ТВЛ як новая генерация ў літаратуры. Тэзісы да навуковага даклада.............................................................................69
*Третьяк И.Д.* Документы зонального госархива в г.Полоцке- одни из источников изучения истории родного края.................................72
*Шупенька І.А.* І.П.Дэйніс - даследчык Полацкай гісторыі ...........79

КПУП "Наваполацкая друкарня". Заказ 6657. Тыраж 50. 2001

**Матэрыялы**
**навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі**
(да 75-годдзя Полацкага краязнаўчага музея
18-19 мая 2001 г.)

КПУП «Новополоцкая типография». Зак. 6657. Тир. 50 экз. 2001 г.